ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 2 (5008) 11 студзеня 2019 г. ISSN 0024-4686

16 +

Ляцкі: вядомы і невядомы стар. 5

Колас «без цэнзуры»? стар. 6

Натхнёная музыкай стар. 15

Каб захаваць унутраную чысціню

У Палацы Рэспублікі ўзнагародзілі лаўрэатаў нацыянальнай прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецпрэмій Прэзідэнта Беларусі.

«Лаўрэаты прэміі “За духоўнае адраджэнне” — людзі, якіх аб’ядноўвае высакароднае імкненне зрабіць свет больш добрым і прыгожым, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. — …Само паняцце “духоўнае адраджэнне” для беларускага народа не проста прыгожая метафара, гэта гімн лёсу беларускага народа. Шмат выпрабаванняў выпала на долю нашай роднай зямлі. Але яна заўжды адраджалася і пачынала квітнець яшчэ больш. Стагоддзямі выхоўваўся і гартаваўся наш нацыянальны характар. Мы сталі больш мудрымі, талерантнымі, а самае галоўнае — больш моцнымі ў сваёй веры ў дабрыню. Мастацтва, якое нарадзілася на беларускай зямлі, заўсёды мела стваральны характар. Таму багатая спадчына нашых продкаў і сёння праслаўляе Беларусь. Імёны многіх асветнікаў, дзеячаў культуры, палітыкі, навукі занялі пачэснае месца на старонках сусветнага летапісу. І мы ганарымся сваёй гісторыяй і зямлёй — радзімай славутых людзей, нашых з вамі суайчыннікаў. Ведаем свае карані, ушаноўваем традыцыі. Лёгка прымаем усё новае — галоўнае, каб яно не супярэчыла нашым законам і каштоўнасцям. Ва ўмовах, калі свет губляе духоўныя арыенціры, імкнёмся захаваць унутраную чысціню…»

Працяг тэмы на стар. 2 ►

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 19002

акцэнты тыдня

Свята. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запаліў калядную свечку ля абраза святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што свята Нараджэння Хрыстовага для беларускага народа — больш чым хрысціянская традыцыя. Яно аб'ядноўвае людзей, незалежна ад ступені духоўнасці і сілы веры, закранае ў сэрцах глыбінныя пачуцці: жаданне любіць, дараваць, жыць у міры і згодзе. «Мы шануем мір, таму што былі сведкамі гора і жахаў войнаў, як ніякі іншы народ у свеце. Беларусы гэта зведалі спаўна. Мы шануем мір і заклікаем усе народы да дружбы і супрацоўніцтва. І ў гэтай місіі наша дзяржава, беларускі народ, наша царква заўсёды былі адзіныя», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Дзяржпадтрымка. Кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне, якім зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Са сродкаў фонду амаль Br358 тыс. накіруюць на заахвочванне 228 прадстаўнікоў таленавітай моладзі дзевяці творчых калектываў. Акрамя таго, выдзелены гранты на арганізацыю і правядзенне рэспубліканскай выстаўкі мастацкіх твораў навучэнцаў дзіцячых школ мастацтваў, рэалізацыю творчага праекта «Музычная спадчына Радзімы» — гастрольна-канцэртнага туру духавога аркестра і салістаў акадэміі музыкі, прымеркаванага да 90-годдзя з дня нараджэння народнага артыста СССР і БССР прафесара Яўгена Глебава і Года малой радзімы, а таксама на набыццё абсталявання для заняткаў мастацкай творчасцю навучэнцаў і студэнтаў устаноў адукацыі сферы культуры.

Узнагароды. За высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена шэрагу супрацоўнікаў сродкаў масавай інфармацыі. У ліку ўзнагароджаных — намеснік загадчыка аддзела палітычных аглядальнікаў галоўнай дырэкцыі Агенцтва тэлевізійных навін Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Наталля Голуб, намеснік дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Ірына Марцьянава, галоўны рэдактар газеты «Знамя юности» Мікалай Мачэкін.

Стасункі. У Нацыянальным гістарычным музеі пачынае працаваць выстаўка мастацкіх фатаграфій «Кітай учора і сёння. Гістарычная і сучасная кітайская архітэктура» дэкана архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, доктара архітэктуры, прафесара Армена Сардарава. Выстаўка прысвечана 70-годдзю ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. Архітэктура, якая развіваецца ўжо больш за 4 тыс. гадоў, стала адным з самых значных дасягненняў кітайскай культуры. Фатаграфіі зроблены ў Пекіне і Шэньчжэні ў 2017 годзе. Унікальныя будынкі, масты, сады і паркі Кітая маюць непаўторны выгляд, які ўвасабляе адначасова практычнасць і эстэтыку.

Святыні. У Гродне завершаны рамонт аднаго з найстаражытнейшых дзеючых храмаў Беларусі — Свята-Барысаглебскай Каложскай царквы XII стагоддзя. Днямі прайшоў падзячны малебен, прысвечаны заканчэнню ўнутраных рамонтных работ у храме. Унутры царквы завершана аздабленне драўлянай сцяны. У якасці матэрыялу выкарыстоўваўся даўгавечны дуб. Цяпер ідзе гаворка пра кансервацыю каменнай часткі храма, стабілізацыю тэмпературна-вільготнага рэжыму ўнутры. Вывучаецца міжнародны досвед ужывання розных тэхналогій кансервацыі.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

з узнагародай!

ДЗЕЛЯ ЧАЛАВЕКА

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка ўручае прэмію «За духоўнае адраджэнне» свяшчэннаслужыцелю Свята-Духава кафедральнага сабора Сергію Гардуну.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прысудзіў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва. Кіраўнік дзяржавы падпісаў адпаведныя ўказы, паведамляе БелТА.

Па выніках 2018 года прысуджаны чатыры прэміі «За духоўнае адраджэнне». Імі адзначаны працоўныя калектывы і прадстаўнікі рэлігійных аб'яднанняў за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы.

Высокай узнагароды ўдастоены аўтарскі калектыў у складзе Юліі Быкавай і Яўгена Алейніка, аўтараў музыкі і тэкстаў песень, за ўвасабленне тэмы малой радзімы ў сучасным эстрадным мастацтве, стварэнне цыкла высокамастацкіх вакальных твораў патрыятычнага кірунку.

Прэмія прысуджана калектывам Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы і Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў каталіцкай царквы камісіі Божага культу і дысцыпліны таінстваў пры Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі за пераклад з арыгінальных моў і выданне кніг Новага Запавету на беларускай мове, што садзейнічае прымнажэнню духоўнай спадчыны.

Калектыў Беларускага дзіцячага хоспіса ўдастоены прэміі «За духоўнае адраджэнне» за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, сцвярджэнне ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, значны ўклад у стварэнне нацыянальнай сістэмы дзіцячай паліятыўнай медыцынскай дапамогі, будаўніцтва на дабрачыннай аснове і арганізацыю работы дзіцячага хоспіса ў пасёлку Вопытны Мінскага раёна.

Узнагарода таксама будзе ўручана калектыву Веснаўскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця за значны ўклад у сцвярджэнне маральных традыцый, ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці, рэалізацыю мерапрыемстваў, накіраваных на сацыялізацыю асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

За выдатныя дасягненні ў сферы прафесійнага мастацтва, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і патрыятычнага выхавання творчай моладзі, дабрачыннай дзейнасці, што атрымалі грамадскае прызнанне, прысуджаны дзевяць спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.

Высокай узнагароды ўдастоены заслужаны калектыў Беларусі «Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь» за выдатныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, рэалізацыю ў 2017—2018 гадах патрыятычнага творчага праекта «Айчыне служым».

Калектыву Пастаўскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва спецыяльная прэмія Прэзідэнта прысуджана за значны ўклад у развіццё аматарскай мастацкай творчасці пажылых людзей і людзей з абмежаванымі магчымасцямі, актыўную гуманітарную і дабрачынную дзейнасць, захаванне рэгіянальных і культурных традыцый.

Сярод лаўрэатаў таксама калектыў Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа, узнагароджаны за выдатныя дасягненні ў навучанні і выхаванні творчай моладзі, значны ўклад у развіццё нацыянальнай школы класічнага танца і правядзенне дабрачынных праектаў «Творчасць юных — роднай Беларусі», «Дзеці дзецям», «І памятае свет выратаваны».

Вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы народны артыст Беларусі Віктар Манаеў удастоены ўзнагароды за высокае прафесійнае майстэрства, значныя дасягненні ў галіне тэатральнага мастацтва, стварэнне ў тэатральным сезоне 2017—2018 гадоў вострахарактарных вобразаў у спектаклях «Рэвізор» і «Школа падаткаплацельшчыкаў».

Калектыў народнага сямейнага ансамбля «Сваякі» філіяла «Дом культуры аграгарадка Юбілейны» Ваўкавыскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці ўзнагароджаны прэміяй за захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускіх традыцый сямейнай аматарскай творчасці, арганізацыю і правядзенне фестывалю-конкурсу творчых сямейных дынастый «Сваякі запрашаюць».

Высокай узнагародай адзначаны аўтарскі калектыў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў складзе начальніка ўпраўлення па распрацоўцы і рэалізацыі спецыяльных праектаў галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета ФПБ Сяргея Камадзея, яго намесніка Алены Голубевай, старшыні Ганцавіцкага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў Наталлі Кандратовіч. Прэмія ім прысуджана за выдатныя дасягненні ў галіне эстраднага мастацтва і правядзенне ў 2018 годзе цыкла канцэртаў рэспубліканскай народна-патрыятычнай акцыі «Мы — разам!», прымеркаванай да Года малой радзімы.

У спіс лаўрэатаў таксама ўключаны творчы калектыў былых малалетніх вязняў фашызму «Лёсы» за значныя дасягненні ў справе захавання памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, патрыятычнае выхаванне моладзі, дастойнае прадстаўленне Беларусі ў час акцыі «Не фашызму! Дзяцінства без вайны!».

Спецыяльная прэмія Прэзідэнта Беларусі прысуджана народнаму інструментальнаму ансамблю «Нясвіжскія лыжкары» за значны ўклад у папулярызацыю музычнага мастацтва, мэтанакіраваную работу па эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення, актыўную канцэртную дзейнасць.

Магістрант Інстытута магістарскай падрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, уладальніца тытулаў «Міс Беларусь — 2018» і «Міс свету Еўропа» Марыя Васілевіч уганаравана ўзнагародай за значны ўклад у развіццё міжнароднага культурнага супрацоўніцтва і актыўную дабрачынную дзейнасць.

Прыняцце ўказаў з'яўляецца яркім сведчаннем пастаяннай увагі дзяржавы да фарміравання ў беларускім грамадстве здаровай духоўнай атмасферы, развіцця беларускай культуры і мастацтва.

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

11 студзеня *— на сустрэчу з пісьменнікамі ў дзіцячую бібліятэку № 12 (11.00).*

12 студзеня *— на юбілейную імпрэзу Тамары Кавалёнак у Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (16.00).*

14 студзеня *— на сустрэчу з Вольгай Шпакевіч у Храм Андрэя Першазванага (13.00).*

14 студзеня *— на літаратурна-музычную імпрэзу «Разам крок» з удзелам Наталіі Касцючэнкі, Аліны Легастаевай, Уладзіміра Тулінава ў Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ждановічы» (15.00).*

15 студзеня *— на літаратурна-музычную імпрэзу «Паэтычны аўторак» з удзелам пісьменнікаў у публічную бібліятэку № 7 (16.00).*

15 студзеня *— на творчую сустрэчу ў літаратурную студыю мастацкага чытання «Вобраз» пры СШ № 168 (14.00).*

16 студзеня *— на сустрэчу з Інай Фраловай у СШ № 26 (10.00).*

16 студзеня *— на сустрэчу з Таццянай Лебедзевай, Ганнай Кашубай, Ірынай Лявонавай у СШ № 19 (13.00).*

16 студзеня *— на сустрэчу з Міхасём Пазняковым у СШ № 165 (14.00).*

16 студзеня *— на юбілейны творчы вечар Міколы Шабовіча «Пад светлым купалам нябёс» у публічную бібліятэку № 1 (17.30).*

17 студзеня *— у Школу юнага паэта пры гарадскім аддзяленні СПБ (14.00).*

Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

17 студзеня *— на калядныя сустрэчы «Раз в крещенский вечерок» літаратурных аб'яднанняў «Выток» (Дзяржынскі раён) і «Нёманец» (Уздзенскі раён) у Дзяржынскую цэнтральную раённую бібліятэку (14.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

10 студзеня *— на калядныя сустрэчы з пісьменнікамі ў Музей выратаваных каштоўнасцяў (14.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

17 студзеня *— на прэзентацыю кніг Галіны і Сяргея Трафімавых з серыі «Рассказы Дзеда Природоведа» ў гімназію № 1 г. Салігорска (12.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

17 студзеня *— на сустрэчу «Хрысціянскія каштоўнасці ў творчасці магілёўскіх пісьменнікаў» з удзелам старшыні абласнога аддзялення СПБ Алеся Казекі ў Цэнтр творчасці «Эверэст» г. Магілёва (15.00).*

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Музей, дзе жыве літаратура

Саюз пісьменнікаў Беларусі падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Стасункі, якія ладзіліся і раней, мелі выключна важнае значэнне для абодвух бакоў.

— Гісторыя літаратуры ствараецца штодня, — заўважае першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах. — Святы ў гонар класікаў, новыя кнігі, прэзентацыі і іншыя творчыя і пазітыўныя рэчы далучаюць прыхільнікаў мастацкага слова да свету прыгожасці. Надзвычай важна, каб тое адметнае, што папаўняе скарбонку нацыянальнай культуры, не знікала бясследна, не страчвалася сярод будзённасці.

Саюз пісьменнікаў з вялікім шанаваннем ставіцца да музея, які займаецца летапісам літаратурнага працэсу, вылучае ў ім найбольш знакавыя постаці, папулярызуе іх творчасць. Пагадненне, падпісанае старшынёй СПБ Мікалаем Чаргінцом і дырэктарам музея гісторыі беларускай літаратуры Міхаілам Рыбаковым, — гэта новае, больш узаемакарыснае рашэнне ўмацоўваць рознабаковыя сувязі. У прыватнасці, супрацоўнікі музея вельмі зацікаўлены ў больш грунтоўным папаўненні сваіх фондаў (архіваў беларускіх пісьменнікаў). І ў той жа час музей — гэта не толькі сховішча, але і месца, дзе жыве літаратура.

Марыя ЛІПЕНЬ

імпрэза

Злучаныя песняй

Уладзіміра Мулявіна і Ігара Лучанка згадаюць падчас канцэрта

Ёсць асобы, чые дні нараджэння становяцца святам для краіны, і нават пасля іх сыходу людзі памятаюць і чакаюць гэтых сустрэч. Так чакаюць дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна прыхільнікі яго таленту і творчасці «Песняроў»: штогод 12 студзеня ў Белдзяржфілармоніі ладзіцца канцэрт у памяць пра музыку. Але сёлета слухачоў чакае двайная сустрэча: з творчасцю «Песняроў» і кампазітара Ігара Лучанка. Невыпадкова: вялікая колькасць яго твораў прагучалі ўпершыню ў выкананні легендарнага беларускага ВІА і дзякуючы яму пакарылі свет. Таму праграма, падрыхтаваная сімфанічным аркестрам «*OLYMPIA CLASSIC*», мае назву «Злучаныя часам: Уладзімір Мулявін і Ігар Лучанок».

Акрамя выдатных песень Ігара Лучанка, якія цяпер гучаць у выкананні маладога пакалення спевакоў, у праграму ўключаны твор аднаго з удзельнікаў легендарных «Песняроў» — заслужанага артыста Беларусі Уладзіміра Ткачэнкі. «Сімфонія "Песняроў"» нагадае пра шлях калектыву і яго самыя этапныя работы. Пазнавальныя мелодыі, што сталі хітамі, злучыліся ў адзін твор, які выконваецца сімфанічным аркестрам разам з саліруючымі інструментамі — цымбаламі і электрагітарай. Сола на электрагітары выканае сам Уладзімір Ткачэнка.

Марыя АСІПЕНКА

конкурсы

Свет сям'і вачыма дзяцей

Выстаўка дзіцячых малюнкаў па выніках творчага конкурсу «Радасць мая», які прайшоў у межах фестывалю сучаснай хрысціянскай культуры «Благавест», адкрыецца сёння ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пры садзейнічанні Беларускай праваслаўнай царквы і Міністэрства адукацыі Беларусі. Адбудзецца і цырымонія ўзнагароджання пераможцаў.

Мэта конкурсу «Радасць мая» — актывізацыя ўзаемадзеяння дзяржавы, царквы, устаноў культуры і адукацыі, грамадскіх аб'яднанняў у фарміраванні грамадскай думкі для падтрымкі традыцыйных духоўна-маральных і сямейных каштоўнасцяў, аказання дапамогі бацькам і сем'ям у выхаванні дзяцей у духу хрысціянскай традыцыі міласэрнага і клапатлівага стаўлення адзін да аднаго і навакольнага свету.

У экспазіцыі прадстаўлены малюнкі дзяцей з розных куткоў краіны, якія былі адзначаны журы конкурсу і сталі пераможцамі ў розных намінацыях. Тэматыка работ — свет сям'і вачыма дзяцей, бо менавіта з сям'і пачынаецца станаўленне чалавека, фарміраванне яго як грамадзяніна, прывіваюцца такія якасці, як любоў да тых, хто побач, прага ведаў, адказнасць за ўчынкі.

Міра ІЎКОВІЧ

дзівасвет

ЗРОБЛЕНА БЕЛАРУСАМІ

Брыльянты чыстай вады вартыя ўзнагарод у Якуціі

П. Лявонаў, В. Цімашоў «Захавальнікі часу».

Якіх толькі цудаў не здараецца на Каляды! У Якуціі, напрыклад, ужо некалькі гадоў запар, як толькі пачынаецца зіма (а зіма, па версіі расіян, пачынаецца з Якуціі), запрашаюць скульптараў на Міжнародны фестываль снежных і лядовых скульптур «Брыльянты Якуціі». І створаныя імі незвычайныя, казачныя кампазіцыі (увечары з рознакаляровай падсветкай) радуюць і здзіўляюць мясцовых жыхароў і гасцей гэтага суровага краю ў парку «Паўночнае ззянне» ажно да вясны. Некалькі гадоў тут вітаюць як лепшых маладых скульптараў з Беларусі. Сёлета ў конкурсе ўдзельнічала 25 каманд з Расіі, Кітая, Манголіі, Беларусі, Канады… Тэма — «Легенды зімы».

Як жа няпроста на марозе выразаць са спецыяльна падрыхтаваных кавалкаў лёду і снегу алегарычныя кампазіцыі! Але нашыя маладыя скульптары Павел Лявонаў і Васіль Цімашоў ні разу не паехалі з Якуціі (як, прынамсі, і з Магадана, дзе праходзіў падобны фестываль) без узнагароды. І сёлета атрымалі дыплом III ступені. Хіба ж не здаецца зробленай з брыльянтаў іх лядовая кампазіцыя «Захавальнікі часу»? А колькі пяшчоты, натуральнасці і рэальнага адчування прыроды ў іх снежнай скульптуры «Глыток свабоды»: конь, што нахіліўся глынуць вады з высечанай у лёдзе палонкі!

Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для падтрымкі таленавітай моладзі Павел Лявонаў і ягоны вучань лаўрэат Нацыянальнай прэміі па выяўленчым мастацтве Васіль Цімашоў добра вядомыя ў нашай рэспубліцы. Створаныя імі кампазіцыі з каменю ўпрыгожваюць многія гарады Беларусі і суседніх краін. Яны ствараюць адмысловыя вобразы з пяску, дрэва, металу, гліны і нават выплятаюць з пруткоў… Цяпер яны са сваімі вучнямі з гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка, якім перадаюць сакрэты, здабытыя ў Якуціі і Магадане, рыхтуюцца да штогадовага фестывалю снежнай і лядовай скульптуры ў Батанічным садзе акадэміі навук Беларусі. У нас вясна прыходзіць рана. Але трапіць у створаны нашымі майстрамі казачны свет Снежнай Каралевы мы, несумненна, паспеем.

Галіна БАГДАНАВА

ЛіМ КАЛЯНДАР

12 студзеня — 100 гадоў з дня нараджэння Васіля Хомчанкі (1919—1992), празаіка, сцэнарыста.

12 студзеня — 90 гадоў з дня нараджэння Дзмітрыя Бугаёва (1929—2017), крытыка, літаратуразнаўца.

14 студзеня — 230 гадоў з дня нараджэння Юзафа Главацкага (1789—1858), мастака, літографа.

14 студзеня — 125 гадоў з дня нараджэння Пятра Юргелевіча (1894—1973), мовазнаўца.

14 студзеня — 115 гадоў з дня нараджэння Віктара Белага (1904—1983), кампазітара, музычнага публіцыста, заслужанага артыста БССР.

14 студзеня — 85 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Лазоўскага (1934—2007), мовазнаўца.

14 студзеня 80 гадоў адзначае Васіль Шаранговіч, графік, педагог, народны мастак Беларусі.

15 студзеня — 120 гадоў з дня нараджэння Сцяпана Скальскага (1899—1972), заслужанага артыста БССР.

16 студзеня — 190 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Спасовіча (1829—1906), публіцыста, літаратуразнаўца, грамадскага дзеяча.

16 студзеня — 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Алоўнікава (1919—1996), кампазітара, грамадскага дзеяча, народнага артыста Беларусі.

17 студзеня — 135 гадоў з дня нараджэння Сяргея Гарадзецкага (1884—1967), рускага паэта, перакладчыка твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

17 студзеня — 115 гадоў з дня нараджэння Алеся (Аляксандра) Якімовіча (1904—1979), празаіка, аднаго з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, паэта, заслужанага дзеяча культуры БССР.

18 студзеня — 85 гадоў з дня нараджэння Вілорыя Казлова (1934—2003), мастака тэлебачання, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

18 студзеня 60-гадовы юбілей святкуе Аляксандр Саладуха, эстрадны спявак.

люстэрка тыдня

На востраве Сардзінія ў Італіі гэтымі днямі пачынаецца серыя канцэртаў беларускіх артыстаў з нагоды Калядаў і старога Новага года, паведаміў БелТА ганаровы консул Рэспублікі Беларусь у горадзе Кальяры Джузэпэ Карбоні. Музычны калектыў з Бабруйска *Musik Kvatro*, які летась пакарыў сэрцы мясцовай публікі, сёлета зноў выступіць на Сардзініі. Акрамя таго, студэнты кальярытанскага ліцэя Пачыноці здымуць кароткаметражны фільм «Каляды надыходзяць двойчы», прымеркаваўшы яго да канцэртаў беларускіх артыстаў. Пасля некаторыя ўдзельнікі гэтай групы студэнтаў наведаюць Беларусь для азнаямлення з рэлігійнымі і культурнымі традыцыямі. Мерапрыемствы праводзяцца пад патранажам Пасольства Беларусі ў Італіі, пры падтрымцы ганаровага консульства Беларусі ў Кальяры.

Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр Расіі пасля 28-гадовага перапынку прадстаўляе гастролі Нацыянальнай оперы «Эстонія», якія праходзяць на Гістарычнай сцэне да 12 студзеня, паведамляе ТАСС. «Кожны раз, калі ёсць магчымасць паказаць, як жывуць і працуюць нашы суседзі і калегі, мы з радасцю прадастаўляем нашу сцэну для гастрольных тураў», — распавёў генеральны дырэктар Вялікага тэатра Расіі Уладзімір Урын. Ініцыятыва правядзення гастроляў належыць генеральнаму дырэктару эстонскай оперы Айвару Мяэ. Рэпертуар для маскоўскіх гастроляў таксама выбіралі самі кіраўнікі тэатра «Эстонія».

Арганізатары «Еўрабачання» — Еўрапейскі вяшчальны саюз *(EBU)* і ізраільская вяшчальная кампанія *KAN* — прадставілі лагатып будучага конкурсу, які пройдзе з 14 па 18 мая ў Тэль-Авіве, паведамляе прэс-служба «Еўрабачання». На лагатыпе — два залатыя трохвугольнікі і адна такая ж постаць з падсветленым контурам, аб'яднаныя ў форме зоркі. Лагатып паўтарае сілуэт сцэны конкурсу, распрацаванай германскім мастаком Флярыянам Відэрам. Раней быў вызначаны слоган «Еўрабачання-2019»: «Дазволь сабе марыць».

Пісьменніца Салі Руні з Ірландыі ўганараваная літаратурнай прэміяй «Коста» *(Costa Book Award)* у катэгорыі «Раман» за кнігу *Normal People*, паведамляе сайт аргкамітэта прэміі. Салі ўсяго 27 гадоў, а *Normal People* — толькі другі яе твор. «Гэта наватарскі раман пра сучаснае жыццё і каханне, які ўзбударажыць любога чытача», — прыводзіцца на сайце кароткая адзнака гэтай кнігі, вынесеная журы. Усе пераможцы ў пэўных катэгорыях (а іх пяць) цяпер будуць прэтэндаваць на галоўную прэмію «Коста» — за лепшую кнігу года. Імя яе лаўрэата будзе названа ўжо 29 студзеня. Прэмія «Коста» лічыцца адной з найбольш прэстыжных узнагарод у літаратурным свеце Вялікабрытаніі і Ірландыі.

Цырымонія ўручэння 76-й прэміі «Залаты глобус» за заслугі ў галіне кінематографа і тэлебачання прайшла ў Лос-Анджэлесе. Лепшым драматычным фільмам названа «Багемская рапсодыя», прысвечаная групе *Queen*, паведамляецца ў *Twitter* «Залатога глобуса». Рамі Малека, які сыграў Фрэдзі Мэрк'юры ў «Багемскай рапсодыі», прызналі лепшым акцёрам у драматычным фільме. З актрыс лепшай стала Глен Клоўз за ролю ў карціне «Жонка». Прэмія «Залаты глобус» прысуджаецца кожны год Асацыяцыяй замежных журналістаў, акрэдытаваных у Галівудзе. Статуэткі ў выглядзе глобуса атрымліваюць пераможцы ў больш як 20 намінацыях.

Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ

землякі

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

ГОНАР БЕЛАРУСКАГА МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Аднойчы, калі я быў уласным карэспандэнтам Дзяржтэлерадыё, мой добры таварыш Віця Цыганкоў, жонка якога працавала выкладчыцай у Наваполацкім музычным вучылішчы параіў: «Расказаў бы ты па рэспубліканскім радыё пра ўнікальнага хлопчыка-баяніста Уладзіка Плігаўку. Міхаіл Іванавіч Івашкін узяў яго ў наша вучылішча, калі яму споўнілася пяць гадоў! Такога яшчэ не было!»

Сапраўды, я быў здзіўлены і заінтрыгаваны. Івашкіна я ведаў як цудоўнага педагога, вельмі інтэлігентнага, адукаванага чалавека. І, адшукаўшы яго тэлефон, папрасіў пазнаёміць мяне з яго юным выхаванцам. Ці мог я тады ўявіць, што ціхі бялявы хлопчык, які прыйдзе разам з настаўнікам на карпункт беларускага радыё, стане гонарам нашай музычнай культуры, уладальнікам «Кубка свету» на конкурсе ў Шатландыі, Гран-пры на міжнародным конкурсе ў Балгарыі, першай прэміі на Вышэйшай лізе акардэоннага майстэрства ў Кіеве, лаўрэатам міжнародных конкурсах ў Парыжы, Маскве, Пекіне?..

А тады больш гаварыў Міхаіл Іванавіч. Уладзік жа адказваў на пытанні ціхім голасам, яўна саромеючыся. Я звярнуў увагу, што на яго баяне нязвыклая клавіятура.

— Спецыяльна зрабілі пад левую руку, — патлумачыў Івашкін. Адчувалася, што ён вельмі любіць і ганарыцца сваім выхаванцам. Што ж, гэты выдатны спецыяліст выхаваў нямала таленавітых музыкантаў, але слава Уладзіслава Плігаўкі зрабіла найбольш яркую старонку ў паслужным спісе педагога.

Мала хто мог уявіць, каб сямігадовы хлопчык выканаў на баяне фартэпіянны «Дзіцячы альбом» Пятра Чайкоўскага, што складаецца з 24-х п'ес і доўжыцца больш за гадзіну. Дарэчы, далейшы шлях юнага музыканта быў звязаны таксама з земляком з Полацка, выдатным баяністам Мікалаем Сеўруковым, выкладчыкам Беларускай акадэміі музыкі.

А сёння і сам Уладзіслаў прыходзіць у класы акадэміі, каб выхоўваць будучых музыкантаў. Любоў да музыкі, асновы майстэрства Плігаўку прывілі з самых першых гадоў жыцця бацькі-музыканты. У іх доме ў Полацку беражна захоўваецца старажытны раяль, прывезены з Баку ад дзядулі. А тата і мама — самі педагогі-музыканты, таму хлопчык рос у музычным асяроддзі. Сёння графік выступленняў беларускага музыканта распісаны на многія месяцы наперад. Дарэчы, я вычытаў такі цікавы факт: у Партугаліі адзін прыхільнік яго таленту скупіў усе білеты на канцэрт Плігаўкі, каб атрымліваць асалоду ад яго майстэрства аднаму.

Уладзіслаў лаўрэат больш як сарака прэстыжных міжнародных конкурсаў, ажно 14 разоў станавіўся стыпендыятам і лаўрэатам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. І, успамінаючы нашу першую сустрэчу, я цешуся, што некалі паспрыяў вядомасці майго земляка, здолеў пазнаёміць нашых беларускім слухачоў з будучым віртуозам-музыкантам.

Той, хто заўсёды прыносіў радасць

Згадваючы пісьменнікаў, з якімі падарыў мне сустрэчу лёс, успамінаю Васіля Хомчанку. І кнігі, якія прачытаў яшчэ школьнікам: Васіль Фёдаравіч спачатку пісаў толькі для дзяцей. Ажываюць у памяці і героі кніг, створаных ім ужо ў сталым узросце, напісаныя на хвалі дэмакратызацыі ў грамадстве, калі прыйшла тая праўда, якая доўгі час замоўчвалася. Першыя подступы рабіліся падчас хрушчоўскай адлігі, і хоць хутка яна завяршылася палітычнымі «замаразкамі», творы цікавыя тым, што ў іх так шмат з уласна перажытага. Асабліва ў апошняй кнізе «Цар — зэк Сямён Івашкін» (1992).

АДЫСЕЯ «ВОРАГА НАРОДА»

У прадмове да адной з аповесцяў пісьменнік прызнаецца: «Я лічу, што маё пакаленне, выбітае даваенным тэрорам і вайной, самае няшчаснае і такое парадзелае, што вельмі рэдка сустрэнеш сваіх равеснікаў». Прыгадвае перыпетыі ўласнага лёсу. З пільнасцю ўлад сутыкнуўся яшчэ ў шостым класе, калі насценную газету, якую даручылі рэдагаваць, назваў «Сацыялісты»: «Прыдумалася лёгка: раз мы будуем сацыялізм, то хто мы?». Яснасць у становішча ўнёс настаўнік Герасімовіч, які не на жарт спалохаўся: «Сацыялісты — здраднікі рабочага класа, апартуністы, ворагі Трэцяга Інтэрнацыянала. Ты даў газеце варожую назву». Знайшоўся і хтосьці больш пільны. Васіль Фёдаравіч сведчыў: «[…] нейкі энкавадыст выклікаў мяне ў сельсавет і ўсё дапытваўся, хто мяне навучыў назваць газету так. Ён мне і растлумачыў, што за антысавецкую дзейнасць нясуць крымінальную адказнасць з чатырнаццаці гадоў. А мне было ўжо столькі».

Аднак гэтым разам пашанцавала. Закончылася ўсё абмеркаваннем на класным сходзе і занясеннем «прозвішча на ганебную чорную дошку, дзе яно красавалася тыдні два. Былі тады такія метады выхавання — чырвоная і чорная дошкі. Перадавікоў заносілі на першую, адстаючых або хто правініўся, — на чорную».

Бяда прыйшла пазней. У сумна вядомым трагічным 1937 годзе, калі вучыўся на апошнім, чацвёртым, курсе рабфака пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. Знайшоўся ў інтэрнацкім пакоі даносчык. А зрабіць В. Хомчанку па тагачасных мерках «ворагам народа» аказалася не так і складана. Акурат атрымаў ад бацькі ліст, у якім той «скардзіўся, што зноў у калгасе атрымалі грашы. З падаткам не разлічыўся, здаў толькі мяса, малако, воўну, а грошай няма». Прасіў, каб сын дапамог. А сын, які вёў дзённік, усё занатаваў. Не прамінуў гэтаму даць і ўласную ацэнку: «І ўсё адбываецца пад шчаслівым сталінскім сонцам».

Арыштавалі, зняволілі ў мінскай турме. Потым былі допыты. Спачатку ў Мінску, пазней — у Віцебску: «Паколькі мінскія турмы былі перапоўнены, іх пачалі разгружаць і адпраўляць арыштаваных у іншыя гарады». Нарэшце адбылася выязная сесія Спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда БССР. Адначасова разглядаліся сотні спраў. Усё ж, відаць, недзе ў глыбіні душы ў суддзяў заставалася, хай сабе і маленькая, часцінка чалавечнасці. Пашкадавалі малалетняга «ворага», якому споўнілася ўсяго васямнаццаць гадоў. Прысудзілі пазбаўленне волі ў папраўча-працоўным лагеры тэрмінам на чатыры гады і на тры гады паражэнне ў правах пасля адбыцця пакарання.

На пачатку 1938 года быў у Бамлагеры. Затым перавялі ў Ніжне-Амурскі. Якраз пачалі будаваць чыгунку ад Камсамольска-на-Амуры да Нікалаеўска-на-Амуры. У асноўным гэта рабілі зняволеныя. Знайшлася работа і В. Хомчанку: «Будаваў чыгунку, пілаваў лес, вазіў сена». Вызвалілі перад самай вайной. Добраахвотнікам пайшоў на фронт. Скончыў Буйнакскае пяхотнае вучылішча, быў камандзірам мінамётнага ўзвода. Дайшоў да Аўстрыі. Аднак з войскам яшчэ доўга не развітваўся. Скончыў у Маскве Ваенна-юрыдычную акадэмію. Дэмабілізаваўся толькі ў 1968 годзе. З 1972 па 1985 год загадваў рэдакцыяй прозы ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

ТОЕ, ЧАГО НЯМА Ў ШАЛАМАВА

Так падрабязна на біяграфіі В. Хомчанкі я спыніўся наўмысна. Праз яе разумееш, чаму Васіль Фёдаравіч не тое, што не мог, а і не меў права не «прыйсці» да кнігі «Цар — зэк Сямён Івашкін». Як і да такіх, як «Чэкістам стала вядома» (1985) і «Стрэл у акно» (1988), што ўспрымаецца працягам папярэдняй. Але менавіта першая ў гэтым шэрагу займае адметнае месца. У згаданай кнізе Васіль Фёдаравіч сказаў тое, што і Варлам Шаламаў у сваіх знакамітых «Калымскіх апавяданнях». Несумненна, ахоп матэрыялу В. Шаламавым куды больш шырокі. Дый спасціжэнне яго месцамі глыбейшае. Як-ніяк, а ягонае зняволенне працягвалася ажно сямнаццаць гадоў. Аднак у В. Хомчанкі ёсць тое, чаго ў аўтара «Калымскіх апавяданняў» не напаткаеш. В. Шаламаў расказваў увогуле пра зняволеных. Незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці. В. Хомчанку асабліва цікавілі супляменнікі. Героі яго твораў — пакутнікі-беларусы, лёсы якіх ламаў таталітарны рэжым. Добрыя, спагадлівыя людзі, яны трапілі ў жорны машыны знішчэння, бо іх палічылі ворагамі, якімі яны ў сапраўднасці не былі.

Як і Сямён Івашкін, царом празваны. Сваю ж мянушку ён атрымаў з-за схільнасці выдумляць самыя розныя неверагодныя гісторыі. Але яго дзівацтвы — не што іншае, як пратэст супраць несправядлівасці, безвыходнасці становішча, у якім апынуўся. Толькі недзе на сподзе душы ў яго спее і пратэст адкрыты. Такі, дзе за жарцікамі не схаваешся.

Сямён даведаўся, што крымінальнікі Бут і Жугроў, адважыўшыся на ўцёкі з лагера, запрашаюць з сабой студэнта Мардоўкіна, каб выкарыстаць яго ў якасці «каровы», калі скончацца прыпасы. Даверлівы Мардоўкін не можа дапусціць такога... Тады Івашкін прама гаворыць Буту і Жугрову, што пра іх думае. І атрымлівае ад апошняга ўдар фінкай у бок.

Адбылося непапраўнае. Ды не быў бы Івашкін Івашкіным, калі б і тут не застаўся аптымістам. «Не шкадуйце мяне, я — жывучы, я заўсёды выжываў. А калі памру, дык у рай пападу. Ты не верыш у рай, а ён ёсць. Я ж нікому не рабіў зла і не маю зла…» — кажа ён Мардоўкіну...

ПРОРВА, ЯКАЯ ПАГЛЫНАЕ

У гулагаўскіх творах В. Хомчанкі моцная дакументальная аснова. Праз канкрэтныя лёсы пісьменнік праўдзіва раскрываў абесчалавечанне грамадства, паказваў тую прорву, у якую яно рухалася: афіцыйна дэкларавалася роўнасць, свабода, братэрства, а на справе саджалі ў турму нават дзяцей.

Адзін з такіх герояў — падлетак з апавядання «Адуванчык», чыё сапраўднае прозвішча ніхто не ведаў: «Яго так усе звалі Адуванчыкам. Ён і быў падобны на адуванчык-кветку...». Арыштавалі Адуванчыка, калі яму яшчэ і пятнаццаці гадоў не было. Асудзілі на шэсць гадоў. Абвінавацілі ў антысавецкай агітацыі (у школьным спектаклі выконваў ролю Жабрака, пад маскай якога хаваецца вораг). Не вытрымаў Адуванчык бесчалавечнасці ў лагеры. Налажыў на сябе рукі… Людскія лёсы, пра якія паведаў В. Хомчанка, у нечым нагадваюць своеасаблівы каравай, што складаецца з некалькіх слаёў. Кожны з іх мае сваю афарбоўку. Усё, як і ў жыцці. Суседзяць дабро і зло, гуманізм і бесчалавечнасць. Ёсць стойкія, нязломныя. Але нямала і нахрапістых, гатовых усім дыктаваць сваю волю.

НАВЁРСТВАЮЧЫ ЎПУШЧАНАЕ

Дэбютаваў В. Хомчанка як паэт. Заявіў пра сябе як пра арыгінальнага дзіцячага пісьменніка зборнікам «Наша вячэра», што пабачыў свет у 1959 годзе. Васіль Фёдаравіч, па сутнасці, стараўся навярстаць упушчанае. Аднак гэта рабілася не на шкоду майстэрству. Прызнаваўся: «[…] хочацца пісаць такія апавяданні, каб з іх нельга было выкінуць ніводнага слова, ніводнага абзаца».

***

У Васіля Фёдаравіча ёсць і аповесць «Я прынёс вам радасць» (1981). Героі яе — пятнаццацігадовыя хлопчыкі і дзяўчынкі. Дзякуючы прыезду археолагаў, нечакана для сябе яны зазірнулі ў мінулае роднага мястэчка. Твор нагадвае юным чытачам, як важна ведаць мінулае свайго краю, паважна і ашчадна ставіцца да яго. Сама ж назва яго на адлегласці часу ўспрымаецца сімвалічна. Заўсёды прыносіў радасць сваёй творчасцю і В. Хомчанка. Таленавіты пісьменнік і найсумленнейшы чалавек.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

ЕЎРАПЕЙСКІ ПРАВАДНІК БЕЛАРУШЧЫНЫ

Адным з нямногіх вельмі аўтарытэтных, палітычна не ангажаваных навукоўцаў, якія ў 1920-я гады вялі сістэмную работу ў напрамку папулярызацыі беларускай культуры ў краінах Еўропы, быў прафесар Яўген Аляксандравіч Ляцкі (1868—1942) — фалькларыст, літаратуразнаўца, пісьменнік.

Яго даследчыцкае прызнанне адбылося ў Расійскай імперыі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. З 1922 года Яўген Ляцкі жыў у Празе, працаваў у Карлавым універсітэце, узначальваў выдавецтва «Пламя», быў куратарам беларускага студэнцтва. Знаёмства з гэтай уплывовай асобай шукалі многія эмігранты, рэгулярную перапіску з ім вялі выбітныя прадстаўнікі рускай літаратуры: Аляксандр Купрын, Зінаіда Гіпіус, Дзмітрый Мережкоўскі, Уладзіслаў Хадасевіч, Марына Цвятаева, Надзея Тэфі і інш.

Доўгі час у гісторыі беларускай навукі Яўген Ляцкі пазіцыянаваўся выключна як фалькларыст. Напрыклад, Ніл Гілевіч у сваёй кнізе «З клопатам пра песні народа. Кароткі нарыс гісторыі і даследавання беларускіх народных песень» (Мінск, БДУ, 1970) даў наступную характарыстыку працы вучонага, апублікаванай у «Известиях Отделения русского языка и словесности Императорской академии наук» (1904, т. IX, кн. 4): «…яго запісы каштоўныя не толькі як матэрыял для вывучэння жывой народнай мовы — яны маюць і немалую мастацкую вартасць»; «Не будзе лішнім заўважыць, што запісаны песні якраз у тых мясцінах, дзе ў дзіцячым і юнацкім узросце іх слухаў і ўбіраў у сэрца будучы вялікі пясняр Беларусі Янка Купала». Нагадаем, што сам збіральнік вусна-паэтычнай творчасці нарадзіўся ў Мінску, у аўтабіяграфіі настальгічна-ўзрушана адзначаў: «Я провел раннее детство в зеленой сказке необъятных лесов — минской Белоруссии».

У чэшскі перыяд жыцця і творчасці допісы Яўгена Ляцкага пра Беларусь рэгулярна змяшчаліся ў славістычных выданнях Чэхаславакіі, Італіі, Францыі, Швецыі, Англіі, але толькі некаторыя з іх сталі аб'ектамі ўвагі спецыялістаў. Спадчына Яўгена Ляцкага спакваля выяўляецца і вяртаецца ў Беларусь, што стварае глебу для яе комплекснага даследавання і аналітычнага асэнсавання. Праўда, за апошнія 20 гадоў адбываецца гэта спарадычна і, як правіла, вакольнымі шляхамі: праз аглядны артыкул Івана Цішчанкі («Полымя», 1999, № 1); зборнік матэрыялаў да біяграфіі, падрыхтаваны расійскім беларусістам Сяргеем Міхальчанкам (Бранск, 2000); манаграфію Марыны Чмаравай (Магілёў, 2004); тэматычны артыкул маскоўскага калегі Аляксандра Жыгалава («Русская речь», 2014, № 1); пераклады з італьянскай Аксаны Данільчык («Запісы 39» БІНІМа, 2017).

У распараджэнні аўтара гэтых радкоў аказалася каля сотні сканаваных старонак рукапісаў і дакументаў з Літаратурнага архіва ў Празе (фонд Яўгена Ляцкага), публікацыя некаторых з іх ажыццёўлена намі ў часопісе «Нёман» (2018, № 12). Аб'ёмістая фактура першакрыніц узнаўляе цэлую сістэму асобасных узаемадачыненняў, міжнароднага супрацоўніцтва, індывідуальна-аўтарскай творчасці. Разам з ужо вядомымі фактамі гэта стварае цікавую фактаграфічную панараму часу, з усімі яго праблемамі, клопатамі, заваёвамі і стратамі.

НАШЫ Ў ПРАЗЕ

Беларуская грамадска-культурная чыннасць у Чэхаславацкай рэспубліцы (ЧСР) міжваеннага перыяду — з'ява беспрэцэдэнтная і вельмі адметная як у нацыянальнай гісторыі, так і ў летапісе міжнародных культурных узаемадачыненняў. Яна звязана з новым узроўнем культурнай ідэнтыфікацыі, супрацоўніцтва, актуалізаваных у многіх еўрапейскіх народаў працэсаў уласнай дзяржаватворчасці. Невыпадкова гэту краіну часта называлі *Еўропай у мініяцюры* або *Славянскай Меккай*.

Прага — адзін з цэнтраў эміграцыі з былой Расійскай імперыі. Акрамя выдатных чэшскіх, нямецкіх спецыялістаў тут актыўна працавалі рускія і ўкраінскія інтэлектулы, якія яшчэ ў часы Расійскай імперыі ў многім вызначалі развіццё гуманітарнай навукі, ход славістычных (літаратуразнаўчых, гістарычных, фалькларыстычных) даследаванняў. Невыпадкова ў эміграцкім асяроддзі Карлаў універсітэт часта называлі «Рускім Оксфардам».

Беларуская грамадска-культурная чыннасць у ЧСР колькасна і «якасна» вельмі моцна саступала рускай і ўкраінскай, ды і па сацыяльным складзе адрозненне было відавочнае. З аднаго боку — прафесура, былыя афіцэры, вядомыя пісьменнікі; з другога — у асноўным небагатыя выхадцы з сялянскіх мас Заходняй Беларусі, якія насуперак перашкодам афіцыйнай Польшчы наважыліся атрымаць вышэйшую адукацыю ў неблагіх умовах, гарантаваных спецыяльнай урадавай праграмай Прагі. Курс на нацыянальную ідэнтычнасць беларусам даводзілася ажыццяўляць ва ўмовах унікальнай «канцэнтраванасці» інтэлектуальных эліт і розных поглядаў на нацыянальнае пытанне, палітычнай размежаванасці.

Гэтая сітуацыя выдатна абмалявана ў рамане Віктара Вальтара «Роджаныя пад Сатурнам» (1931). Адзін з эпізодаў эпічнага твора прадстаўляе славянскую вечарыну, арганізаваную з запрашэннем ганаровых гасцей — універсітэцкай прафесуры. У праграме разам з прафесійнымі выканаўчымі калектывамі заяўлены самадзейны хор беларускіх студэнтаў. Выступаць давялося пасля знакамітага чэшскага квартэта, пачуццё адказнасці і псіхалагічная напружанасць ад гэтага толькі ўзмацніліся: «У гэты час падняўся на сцэну высокі і прыгожы прафесар Ляцкі. Ён паведаміў прысутным, што зараз выступяць беларусы, што беларусы — адзін з славянскіх народаў, які мы яшчэ мала ведаем. Ён доўга гутарыў аб беларусах, аб беларускай літаратуры, аб беларускім руху».

СЛАВІСТЫЧНЫЯ ФОРУМЫ

Прага здаўна сцвердзілася як адзін з цэнтраў славянства. У міжваенны перыяд гэтае рэнамэ падмацоўвалася шэрагам міжнародных ініцыятыў. У 1924 годзе тут быў праведзены з'езд славянскіх этнографаў і географаў, на якім Расійскую акадэмію навук прадстаўляў Яўхім Карскі. Уладзімір Жылка, студэнт філасофскага факультэта Карлавага ўніверсітэта, пісаў Антону Луцкевічу ў Вільню 24 чэрвеня 1924 года: «Карскі дзяржаўся вельмі хораша і крытычна да саввлады і заставіў добрае ўражанне на прысутных сваёй незалежнасцю і нат (як ні дзіўна)… беларускасцю»; «На пытанне аб літаратурным жыцці даслоўны адказ Карскага: "— Купала, кажуць, п'ець, а вось Каласок наш расце; цяпер можна смела сказаць, што светавая велічына"».

Яўген Ляцкі напісаў станоўчую рэцэнзію на трэці том «Беларусаў» Яўхіма Карскага, выдадзены ў Петраградзе ў двух выпусках (1921, 1922). Яе рукапіс захоўваецца ў Літаратурным архіве ў Празе, а выдавецкі лёс пакуль што не вядомы. Паводле назіранняў гісторыка мовазнаўства Дзмітрыя Дзятко, менавіта ў гэты час у Савецкім Саюзе на Карскага ўздымаецца хваля афіцыйнай, публічнай дыскрэдытацыі. У 1929 годзе, калі ў Празе адбудзецца першы міжнародны з'езд славістаў, Яўхім Карскі стане акадэмікам Чэшскай акадэміі навук.

У 1926 годзе афіцыйным лістом кіраўніцтва Інбелкульта Яўген Ляцкі ў ліку вядучых еўрапейскіх славістаў быў запрошаны ў Мінск на Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі. Прафесар паехаць не змог, а чарнавік яго ліста з пражскага архіва нечакана прадстаўляе нам беларускамоўнага Яўгена Ляцкага:

Я надзвычай пацешаны запрошаннем камітэта… і прашу прыняць маю шчырую ўдзячнасць. Сочучы з найвялікшай увагай за культурнымі дасягненнямі майго роднага краю, радуюся яго поспехам і жадаю самых спрыяючых варункаў для іх дальнейшага развіцця. Шчыра шкадую, што мае універсітэцкія абавязкі ў Празе перашкаджаюць мне асабіста прыняць удзел у гэтым з'езду. Але спадзяюся, што абставіны дазволяць мне ў бліжэйшым будучым асабіста пазнаёміцца з тымі дзеячамі, якія кладуць такі бліскучы пачатак будучаму слаўнаму развіццю беларускай культуры.

Зайздрошчу тым, хто мае шчасце быць у сучасны момант яе будаўнікамі. Прашу Вас, Грамадзянін Старшыня, прыняць і перадаць зьезду маё гарачае прывітанне.

Аўгень Ляцкі.

На мінскай канферэнцыі ў прывітальным слове ад імя рэдакцыі часопіса «Прамень» і беларускага студэнцтва ў Чэхаславакіі Уладзімір Жылка адначыў наступнае: «…там у нас на Захадзе, дзе ідзе цяжкае змаганне ня толькі за сваю культуру, але і за нацыянальнае існаванне, за права "людзьмі звацца", там к здабыткам беларускай навукі асабліва прыслухоўваюцца. Кожны новы крок, кожны новы поспех беларускай культуры з'яўляецца там, на Захадзе, новай сілаю, новай зброяй у руках беларускіх мас, якія ў апошнія гады паднялі сцяг змагання».

СПАЧАТКУ БЫЛО «СЛОВА…»

Шырокая вядомасць і непахісны аўтарытэт помніка старажытнарускай пісьменнасці, даследаваннем і выданнем якога займаўся Я. Ляцкі, даюць магчымасць наглядна праілюстраваць спецыфіку навуковых падыходаў даследчыка і гістарычнае значэнне вынікаў яго працы ў еўрапейскім маштабе рэтраспектыўнага бачання.

Прафесар Карлавага ўніверсітэта апублікаваў шэраг сваіх прац, прысвечаных «Слову пра паход Ігаравы» ў Чэхаславакіі і Югаславіі, быў навуковым кіраўніком доктарскай дысертацыі Любові Вернікоўскай «"Слова…" як мастацкі і гістарычны помнік», абароненай у 1930 годзе.

Спробы праясніць некаторыя «цёмныя месцы» помніка знаходзім у перапісцы з Вацлавам Ластоўскім, які ў лісце ад 26 чэрвеня 1926 года пісаў свайму пражскаму калегу: «…упамінаецца "бусово время". Гэты зварот "Слова", здаецца, тлумачыць запісаны ў б. Новааляксандраўскім павеце зварот крыўскай мовы. Там называюць час і працэс налівання і даспявання ягад і зярна словам "бусьнець". Дык "бусово время" павінна значыць час даспявання, набірання паўнаты і росквіту пладародных сіл».

Звароты «Паважаны грамадзянін!» або «Вельмі паважаны Пане Прафэсару!» адразу сведчылі пра грамадскі лад краіны паходжання карэспандэнцыі.

У Літаратурным архіве (Прага) захоўваюцца два лісты Цішкі Гартнага да Яўгена Ляцкага. Адзін напісаны па-руску і датаваны 19 лістапада 1925 года. У ім выказваецца спадзяванне, што пражскі адрасат пры больш спрыяльных умовах выдасць зборнік артыкулаў мінскага просьбіта. Другі, недатаваны, афармлены надзвычай ліберальна, з многімі праўкамі. Адрасант, які на той час узначальваў шэраг устаноў (Дзяржвыдавецтва, Галоўмастацтва, Цэнтральны архіў БССР), меў высокія пасады, замяніў іх пералік шматкроп'ем:

Старшыня…

Цішка Гартны

Паважаны Грамадзянін!

Ня ведаю, ці атрымалі Вы майго ліста, які я адрасаваў на Ваша імя. У ім я дзякаваў Вам за прысланыя кнігі. Чытаючы іх, ізноў звяртаюся думкай да Вас і яшчэ раз адчуваю патрэбу шчыра падзякаваць Вам за тую радасць, якую дае мне беларуская творчасць на нашай мілай мове.

Пастараюся, каб аб гэтых кнігах даведаліся і іншыя, што ня ўмеюць чытаць па-беларуску.

Жадаю Вам добрага поспеху ў Вашых пісьменніцкіх справах і культурнай працы.

Беларусазнаўчы плён Яўгена Ляцкага прадстаўлены ў рукапісах дзясяткаў артыкулаў, еўрапейскі публікацыйны лёс многіх з іх чакае свайго даследавання. Шаноўны прафесар рэпрэзентаваў беларускую літаратурную класіку, поспехі нацыянальнага культурнага будаўніцтва, арганічна ўлучаў найноўшыя беларускія даследаванні ва ўстаялую славістычную традыцыю, сучасны навуковы дыскурс. Вынікі яго працы маглі б скласці аб'ёмісты том публікацый, стаць гісторыяй і ўзорам культурнай дыпламатыі.

Мікола ТРУС,
дактарант Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

НЕ ТЫЯ КРУГІ,

ці Як ствараюцца міфы

Напрыканцы 2018 года выйшла з друку паэма Якуба Коласа «Сымон-музыка» ў першай рэдакцыі, акурат да 100-годдзя яе стварэння. Гэта выданне з серыі «Без цэнзуры» адметнае тым, што магчыма прасачыць, як паэт працаваў, дакладней, перапрацоўваў паэму ў наступныя гады. Да выдання спрычынілася шмат неабыякавых. Ідэю выдання першай рэдакцыі «Сымона-музыкі» асобнай кнігай даўно выказваў малодшы сын песняра Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч, які напісаў да яе натхнёную прадмову. Ідэю падхапіў і выступіў каардынатарам праекта Глеб Лабадзенка. Укладальніку кнігі Анатолю Трафімчыку, які прарабіў значную частку работы, аказвалі дапамогу ў наборы тэксту з захаваннем асаблівасцяў арфаграфіі 49 валанцёраў. Мастак вокладкі Зміцер Гулянец максімальна насыціў яе інфармацыяй. Кніга аздоблена ілюстратыўным матэрыялам, выдадзена накладам 500 асобнікаў на мелаванай паперы і, як заўялена ўкладальнікам, прызначана шырокаму колу чытачоў, мае папулярны характар. І гэта вельмі добра.

Але ў гэтую бочку мёду дабаўлена і лыжка дзёгцю. Маю на ўвазе аж 33 старонкі пасляслоўя (паслямовы) укладальніка пад назвай «"Кругі пакуты і блукання" "Сымона-музыкі" (яшчэ раз пра гісторыю твора: умовы і фактары ўзнікнення)». Заўважым, «яшчэ раз». Пад рознымі назвамі загалоўкаў і падраздзелаў адно і тое ж Анатоль Віктаравіч перадрукоўвае з артыкулаў у кнігі на працягу чатырох гадоў: газетныя публікацыі і інтэрв'ю, часопіс «Полымя» № 6 за 2015 год, кнігі «Колас зямлі беларускай: дапаможнік для настаўнікаў» (2017), «Крыніцы паэтычнага натхнення: перадумовы стварэння класічных твораў Якуба Коласа» (2017). Разлік на сенсацыйнасць амбіцыйных высноў не спраўдзіўся, таму ўкладальнік вырашыў паўтарыцца і ў гэтым, заўважым, літаратурна-мастацкім выданні для шырокага кола чытачоў.

Сутнасць высноў А. Трафімчыка зводзіцца да наступнага:

сумніўна, што Якуб Колас перапрацоўваў паэму да ад'езду на лячэнне ў Кіславодск у 1924 годзе, бо не засталося чарнавікоў;

у Кіславодску да Якуба Коласа, дзе паэт працаваў над паэмай «Сымон-музыка», быў прыстаўлены (а не адпачываў) у якасці цэнзара тагачасны старшыня Галоўліта БССР Р. К. Шукевіч-Траццякоў;

падчас вяртання з курорта дамоў па тэхнічных параметрах немагчыма было скрасці чамадан у паэта, дзе быў і рукапіс перапрацаванай паэмы;

пошукі скрадзенага багажу супрацоўнікамі ГПУ носяць палітычны характар;

далейшае перастварэнне паэмы мае шмат нестыковак.

Карацей кажучы, ніякага крадзяжу рукапісу не было, Колас хлусіў пра гэты выпадак і надалей усё жыццё, жонка паэта не магла дапамагаць яму аднаўляць паэму, так званай трэцяй рэдакцыі не было. А каментарыі аддзела тэксталогіі акадэмічнага Інстытута літаратуразнаўства да 9-га тома 20-томнага збору твораў Якуба Коласа, у які ўключаны трэцяя, першая рэдакцыі і розныя варыянты паэмы «Сымон-музыка» (рэдактар тома М. І. Мушынскі), не выклікаюць у А. Трафімчыка даверу. Затое, на думку ўкладальніка, Якуб Колас выступіў у ролі ледзь не Настрадамуса, бабы Вангі ці Паўла Глобы, быццам прадказаўшы расстрэл апошняга расійскага цара. Ну чым не сенсацыя і як «абагацілася» коласазнаўства!

На старонках пасляслоўя А. Трафімчык прыводзіць словы малодшага сына песняра Міхася Канстанцінавіча «Колас ніколі не лгаў», але тут жа дапускае, што крадзеж рукапісу паэмы ў 1924 годзе — «усяго толькі невялікая алегорыя». Міхась Канстанцінавіч нарадзіўся ў 1926 годзе, шмат робіць для захавання памяці пра свайго бацьку і дай Бог яму яшчэ радаваць нас сваёю прысутнасцю. А вось яго старэйшаму брату Данілу Канстанцінавічу ў 1924 годзе было 10 гадоў і ён цудоўна памятаў гэту гісторыю, пра што занатавана ў ягонай кнізе «Любіць і помніць. Успамінае сын Якуба Коласа»: «Пасля выхаду ў свет паэмы "Новая зямля" (да 1 ліпеня 1923 года) у верасні-снежні таго ж года Колас прыступіў да карэннай перапрацоўкі "Сымона-музыкі"», гэта азначае, што перастварэнне паэмы адбывалася на працягу 6—9 месяцаў да ад'езду на лячэнне ў Кіславодск. А першым слухачом і крытыкам была жонка Марыя Дзмітрыеўна, якая мела выдатную памяць настаўніцы і з лёгкасцю запамінала тэкст. Дарэчы, Даніла Канстанцінавіч нам дома не раз апавядаў пра гэта. Нават яму, хлапчуку, запомнілася, як перажываў тады яго бацька: «У жніўні 1924 года Колас пачынае працу над трэцяй рэдакцыяй паэмы. Памятаю, што ў нас дома ўсе ўспрынялі гэту страту як вялікае няшчасце. Бацька многае аднаўляў у памяці, часамі памагала і мама, якой першай чыталася паэма».

Разважанні аўтара пасляслоўя пра незахаванасць чарнавікоў паэмы і для каго прызначалася памета Коласа трохгадовай даўнасці пра крадзеж на лісце да жонкі выглядаюць па меншай меры дзіўнымі. А з чым жа паехаў на курорт паэт, каб працаваць над завяршэннем паэмы? Якуб Колас памятаў пра гэта прыкрае здарэнне ўсё жыццё. А памету летам 1927 года на палях свайго



ліста да жонкі з Кіславодска ён хутчэй за ўсё рабіў, парадкуючы рукапісы, кнігі, рэчы перад пераездам у свой уласны дом на Вайсковым завулку, які адбыўся ўвосень 1927 года. Дарэчы, якраз лісты Коласа да жонкі 1923—1926 гадоў дайшлі да нашых дзён таксама ў выніку... крадзяжу! Вельмі прафесійнаму крадзяжу, бо яны апынуліся ў Л. А. Бэндэ перад вайной (цяпер арыгіналы знаходзяцца ў Інстытуце расійскай літаратуры РАН, у Санкт-Пецярбургу). У лісце ад 31 сакавіка 1941 года Якуб Колас запытаў у Бэндэ: «Меня интересует, как очутились у Вас мои 29 писем?». Вось дзе дэтэктыўная гісторыя!

Чарнавыя ці чыставыя рукапісы твораў Коласа 1920-х гадоў можна пералічыць па пальцах. Усё, што было ў доме паэта, загінула 24 чэрвеня 1941 года.

А вось, цытую А. Трафімчыка, «збярогся, перажыўшы ўсе віхуры часу нават рукапіс першай рэдакцыі "Сымона"». Як? Выключна дзякуючы Коласавай шчодрасці. Паэт падараваў гэты каштоўны сшытачак прафесару хіміі Белдзяржуніверсітэта Б. М. Беркенгейму, калі той ад'язджаў на працу ў Маскву. А колькі кніг і ўнікальных фотаздымкаў, што былі падпісаны і падараваны Коласам сваім блізкім, сябрам і знаёмым, вярнулася пасля ў дом песняра.

Калі звяртацца да асобы Радзівона Канстанцінавіча Шукевіча-Траццякова, то зазначу, што яго біяграфія вывучана даволі павярхоўна і яшчэ патрабуе даследавання як асобы з акружэння песняра. Нават месца яго нараджэння ў даведніках і энцыклапедыях не супадае з сапраўдным і занатаваным уласнай рукою Р. К. Шукевіча-Траццякова ў дакументах пачатку 1920-х гадоў, што захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. У сапраўднасці Р. К. Шукевіч-Траццякоў нарадзіўся ў сяле Сотніцкае (цяпер назва іншая) Суджанскага павета Курскай губерні, а не на тэрыторыі Беларусі. Гэта прыблізна за 60—70 кіламетраў ад курскай Абаяні, адкуль зусім нядаўна, вясною 1921 года, вярнуўся на Бацькаўшчыну Якуб Колас. Лагічным бачацца іх сустрэчы на курорце і ў размовах, і за шахматамі (Шукевіч-Траццякоў быў прафесійным шахматыстам), і, зразумела, Колас даваў чытаць «Сымона-музыку» старшыні Галоўліта. Магчыма, гэта было нават у інтарэсах Якуба Коласа: пасля вяртання ў Мінск усё роўна трэба было б аддаваць паэму ў цэнзуру, а тут старшыня Галоўліта яе прачытаў, у цэлым гэтая (другая) рэдакцыя Коласавай паэмы яго задаволіла, пасля прыезду хутка афармілі б пратаколам і здалі ў друк. Р. К. Шукевіч-Траццякоў быў не з горшых рэдактараў. Акрамя беларускай і расійскай ён валодаў нямецкай, французскай, італьянскай, польскай мовамі, вывучаў эсперанта.

У тым жа 1924 годзе Р. К. Шукевіча-Траццякова перавялі на іншую працу. Да беларускіх пісьменнікаў, і ў прыватнасці да Якуба Коласа, ён ставіўся прыязна. Напрыклад, калі ў 1926 годзе святкавалі 20-годдзе творчай дзейнасці Коласа, у «Чырвоным сейбіце», дадатку газеты «Беларуская вёска», яе галоўны рэдактар Шукевіч-Траццякоў пісаў: «...ад "Палескай глушы" Колас пакуль што не дайшоў да сучасных падзей... Ён дойдзе да іх пазней, калі сучасныя дні ўжо стануць гісторыяй. Але адаб'е іх у сваіх творах і як добры мастак, і як праўдзівы летапісец... Не перашкаджайце ж Коласу!».

Цяпер што датычыць эпізоду вяртання Коласа з курорта дадому. Крадзяжы на чыгунцы былі звычайнай справай у першыя гады станаўлення краіны Саветаў, ды і ў пазнейшыя часы. Вось што пісаў Колас жонцы з наступнага каўказскага адпачынку ў 1926 годзе з Есентукоў: «У дарозе нічога асаблівага не здарылася. Заходзілі тры разы жулікі, укралі з нашага купэ туфлі ў аднае дзяўчыны з Бабруйска…Праўда, яго зараз жа, на першай астаноўцы, злавілі і адабралі туфлі» і далей пра іншыя здарэнні. А вось самому Коласу ў 1924 годзе, на жаль, не пашанцавала: яго скрадзены багаж па гарачых слядах не адшукалі.

Чамадан, з якім ездзіў у Кіславодск паэт, сапраўды быў цяжкі. У ім былі не толькі побытавыя рэчы і рукапісы другой рэдакцыі паэмы, але і добры дзясятак кніг («Новая зямля», «Казкі жыцця», «У палескай глушы» і інш.) і часопісаў. Амаль у кожным лісце да жонкі з Кіславодска Колас паведамляў, што ці ён сам чытае свае творы курортнай публіцы, ці кнігі ў яго для чытання бяруць. Так, чамадан сапраўды быў цяжкі для Коласа, які важыў на той час 61 кілаграмаў (гэта пры росце 179 см) і пакутаваў ад язвы страўніка. Вагу паэта можна вылічыць з яго лістоў, бо яна пададзена як 3 пуды 28 фунтаў 92 залатнікі! У адным з такіх лістоў да жонкі Колас напісаў: «Я ніяк не прыбываю… Пісаў мне Некрашэвіч. Ён пажартаваў з мае лёгкасці. Кажа, у гэтым ёсць і добры бок: можна залезці на Казбек, уставіць пяро і паляцець у Мінск». А вось для злодзея-бамбізы ці групы зладзюг чамадан наўрад ці быў цяжкі. Калі цяжкі, значыць, ёсць чым пажывіцца, — такі быў разлік.

Напалохаўся А. Трафімчык з'яўленнем супрацоўніка ГПУ (у сапраўднасці — АДПУ: у лістападзе 1923 года Галоўнае палітычнае ўпраўленне было пераўтворана ў Аб'яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне) на этапе пошукаў чамадана. Гэта не «сведчанне палітычнай важнасці справы», як мроіцца аўтару пасляслоўя, а звычайная працэдура на чыгунцы ў той час. Калі казаць сучаснай мовай, функцыі транспартнай міліцыі тады выконвалі супрацоўнікі (агенты) АДПУ. Як вядома, Якуба Коласа абакралі на станцыі Ціхарэцкая, ён сышоў з цягніка на наступнай — Растоў-на-Доне, дзе на пару дзён спыніўся ў свайго даўняга сябра Якава Бязмена. Ведаючы, што ёсць, дзе спыніцца, Колас сышоў з цягніка, мяркую, каб заявіць аб крадзяжы багажу. Ён меў вялікае спадзяванне, што ўдасца хутка злавіць зладзюг і вярнуць дапрацаваную і прачытаную цэнзарам другую рэдакцыю паэмы, ну, каму ж патрэбны рукапісы!

Амаль праз месяц марнага чакання вынікаў пошукаў Колас з Мінска напісаў Бязмену: «навядзі ты спраўкі на ст.[анцыі] Растоў-на-Д.[оне] у агента ГПУ Мажарава... Рукапіс гэты выбіў мяне з сядла, дык парупся, браток». Звяртаем увагу — «на станцыі»: гэта чыгуначная станцыя, дзе рознымі здарэннямі займалася адпаведнае ведамства.

Далей Якубу Коласу давялося ў сціслыя тэрміны за чатыры — чатыры з паловай месяца аднаўляць паэму, пра што згадвалася вышэй. Ніякіх тут нестыковак, як піша ўкладальнік «Сымона-музыкі. Без цэнзуры», не было. У кнізе «Сымон-музыка» 1925 года ў прадмове ад выдавецтва на старонцы 3 чытаем: «Але Я. Колас не спыняецца перад такой цяжкай няўдачай. Ён мужна прыступае зноў да паэмы, і к пачатку 1925 г. з-пад яго пяра выходзіць "Сымон-музыка" ў трэцяй рэдакцыі». Заўважым, «да пачатку 1925 года». Рукапіс трэцяй рэдакцыі паэмы быў здадзены ў друкарню ў чэрвені 1925 года, а сама кніга выйшла з друку ў ліпені—жніўні таго ж года. Адсюль вынікае, што ў студзені — чэрвені 1925 года спачатку рукапіс праглядаўся цэнзарамі, пасля чаго быў дапрацаваны з улікам іх заўваг аўтарам паэмы. Тут, бясспрэчна, бачны больш жорсткі кантроль Галоўлітбела новага складу, а не пад старшынствам Р. К. Шукевіча-Траццякова.

Па сутнасці, чытачоў новай кнігі «Сымона-музыкі. Без цэнзуры» дастаткова было коратка пазнаёміць з гісторыяй стварэння найвыдатнейшага твора беларускай літаратуры.

Унутранага аўтарскага самакантролю не дастае А. Трафімчыку. Яго пасляслоўе (паслямова) загрувашчана патокам не вельмі зразумелых разважанняў, пры гэтым 35 працэнтаў тэксту складаюць цытаты. Колькі не прымяняў «комплексу метадаў» аўтар прадмовы і пасляслоўя (паслямовы), ён жа ўкладальнік, каментатар, стыльрэдактар, карэктар, па факце атрымалася няўдалая аб'ёмная кампаноўка матэрыялаў пасляслоўя, ды і на кошце кнігі гэта, безумоўна, адбілася.

Кропку ў літаратурна-мастацкім выданні Якуба Коласа «Сымон-музыка. Без цэнзуры» варта было паставіць там, дзе паставіў яе аўтар паэтычнага шэдэўра, а «Кругі…» няхай сабе ідуць па вадзе…

Вера МІЦКЕВІЧ

Я пішу табе...

Калі раптам зімовая панурасць бярэ над вамі верх (бо сонейка цяпер рэдкі госць у нашых амаль паўночных шыротах), калі не стае яркіх уражанняў, снежаньскі часопіс «Полымя» — якраз тое, што ўздыме настрой! І адкрывае нумар цудоўная лірычная падборка Таццяны Сівец пад назвай «Лісты да Ліса». Відавочна, што назва адсылае наўпрост да сусветна вядомага і найулюбёнейшага твора «Маленькі прынц». І ў саміх вершах шмат алюзій на яго таксама. Але ўдумлівы чытач адшукае ў іх нямала агульнага і з уласнымі думкамі і перажываннямі. Лірычны герой Таццяны Сівец — закаханы і безабаронны ў сваіх пачуццях, адкрыты, шчыры, уразлівы. Пра такіх гавораць: «без скуры»... Менавіта такому чытачу і адрасаваны радкі: *«Ліс, тут нічога не дапаможа: / Ні віскі, ні Pater Noster — / Мне яе не пазбыцца ніяк, ні з кім — / Гэтай тройчы выклятай Адзіноты! / Вось і цяпер — я пішу табе, а яна так блізка — / Дыхае ў спіну і заглядае ў ліст мой...»*

Гэты вобраз дае нагоду для пытання: чаму менавіта ў каханні самота адчуваецца найвастрэй: здавалася б, ёсць Нехта, пра каго ўвесь час думаеш і з кім размаўляеш у думках, ды раптам *«...я, напэўна, вар'ят, але часам мне падаецца, / Што гэта яна* (г. зн. Адзінота) *пад маімі павекамі птушкай б'ецца... / Мне цікава, пакуль я з табою, Ліс, / З кім яна?..»*

Як і іншая добрая паэзія, лірыка Т. Сівец не дае ні парадаў, ні гатовых адказаў, а, наадварот, паглыбляе чытача ва ўласны свет і выклікае ланцужковую рэакцыю яркіх успышак перажыванняў ды згадак...

Тонкай арыгінальнай вобразнасцю зачароўвае і падборка Фёдара Гурыновіча пад назвай *«Апошняя незабудка»: «Неба — сіняй калыскаю. / Тонкі ліст з пазалотай. / Колькі вершаў рассыпана / Па лясах, па балотах!»*

Лірычныя героі Соф'і Шах і Рыгора Бабчанка (вершаваныя падборкі «Не чужая» і «Сюды я зноў вярнуся...» адпаведна) настальгуюць па родных мясцінах, дзе спазнавалі свет, дзе былі ахінутыя бацькоўскай любоўю і спагадай.

Проза на старонках часопіса таксама парадавала: аўтары Наталля Туміловіч, Святлана Бязлепкіна, Алесь Камароўскі і Ягор Конеў глыбока і псіхалагічна тонка паглыбляюцца ва ўнутраны свет сваіх герояў і адкрываюць іх для чытача.

Апавяданне «Родны дом» Н. Туміловіч напачатку падаецца простым летапісаннем. Валерый, сталы чалавек, у якога, здавалася б, усё ў жыцці склалася добра, вяртаецца як на экскурсію ў тыя мясціны, дзе калісьці быў самым шчаслівым, дзе мінула яго дзяцінства, і прыгадвае «вехі» шчасця, пракручвае ў памяці моманты блізасці з матуляй, якой ужо няма. Жанчына, з якою яго зводзіць лёс, на першы погляд выпадковая. І толькі ў фінале разумееш, навошта было гэта «збліжэнне»: абодва героі носяць у сабе пачуццё страшэннай віны, не могуць сабе дараваць: Валерый — гібелі дачкі ў аўтакатастрофе, Валянціна — таго, што не зберагла кахання...

Гераіні Святланы Бязлепкінай (апавяданні «Па законе фотагеніі» і «Перадкалядная гісторыя») — сучасныя гараджанкі, прафесіяналы ў сваёй справе, самастойныя, не залежныя ні ад кога, здольныя імгненна прымаць рашэнні... Асабліва цікавы першы з твораў: на прыкладзе сямейнай пары акцёраў пісьменніца знаёміць з тонкасцямі сцэнічных пастановак і адкрывае сакрэты кінематаграфічнага мастацтва. Гэта ўнікальны досвед, што зазвычай застаецца па-за кадрам, па той бок кулісаў, а тут чытач нібы сам трапляе ў багемны асяродак — настолькі змястоўна, каларытна, з гумарам і жывой мовай ён апісаны, што верыш кожнаму слову... А праблемы, якія стаяць перад гераіняй твора, актуальныя для любой жанчыны: як знайсці кампраміс паміж сям'ёй і працай, падтрымаць веру ў сябе і сваю «геніяльнасць» мужа і дапамагчы яму з кар'ерай, пры гэтым ахвяруючы ўласным талентам... Зрэшты, як застацца жанчынай, якую хацелася б абараніць і падтрымаць, у свеце, што пастаянна вымагае зусім іншых якасцяў — супрацьлеглых...

Апавяданне Алеся Камароўскага «Удар залатой буцы» таксама адкрывае ўнікальны досвед. Галоўны герой Вадзік — паспяховы ігрок зборнай краіны па футболе. Нават далёкаму ад гэтага віду спорту чытачу цікава «апынуцца» на гульнявым полі падчас матча. Адзіны момант, які, падавалася б, ні для чаго — сон пра ампутацыю нагі — так і чакаеш чагосьці падобнага ў фінале... Дый сам фінал як абарваны — быццам аўтар перапыніў расповед, каб неўзабаве (у наступным нумары) да яго вярнуцца...

Ягор Конеў паспрабаваў разабрацца, у чым сакрэт незвычайнай сілы летапіснага героя, які не прайграў ніводнага двубою з ворагам (легенда «Загадкі волата Барэйкі»). Нічога звышнатуральнага тут няма, мяркуе аўтар: героя «ствараюць» іх жанчыны. «...І ў гэтай заклапочанасці Альдоны я распазнаў разгадку таямніцы волата Барэйкі. Яе самаадданасць падалася роўнай учынкам Клары Джэйн Форд, якая натхніла мужа на вынаходніцтва аўтамабіля, стоячы побач з ім у гаражы з лямпай у руках, пакуль ён у прыцемках канструяваў матор... Або яшчэ тысячам жанчын, якія самаахвярным каханнем дапамагалі сваім мужчынам ажыццяўляць непрадказальныя здзяйсненні, нават ператварацца ў волатаў».

Рубрыка «Галасы свету» знаёміць з творчасцю туркменскага пісьменніка Атаджана Тагана, які прадстаўлены апавяданнем «Цягнік праходзіць». Праз свет дзевяностагадовага старога, які амаль усё жыццё працаваў чабаном, пісьменнік паказвае менталітэт сваёй нацыі.

Яна БУДОВІЧ

Быццё чалавека

Так, менавіта быццём, а не жыццём часам хочацца назваць існаванне ледзь не ўсяго чалавецтва на працягу стагоддзяў. Ды ў філасофіі яно яшчэ вызначае свядомасць. На старонках снежаньскага «Нёмана» абодва сцвярджэнні падтрымліваюцца як нельга лепей.

Напрыклад, у аповесці Анатоля Казлова «Пытанне і шматкроп'е, або Голас» (пераклад з беларускай мовы Алега Пушкіна) галоўны герой нібыта існуе, а не жыве. І вінаваціць ён, перш за ўсё, навакольны свет, а толькі потым — сябе. Голас, які яму раптоўна з'яўляецца, а затым знікае, цэлы дзень наводзячы на ўспаміны і думкі, нібы прымушае прыняць гэты свет і хоць крыху пабыць у нечым вінаватым. Вяртанне ў дзяцінства, успамін пра першае каханне, напамін пра раннюю страту бацькі, пахаванне маці, адчуванне праз гады цеплыні і чысціні прыроды, пачуццёвае яднанне з вёскай дзяцінства блытаюцца ў памяці галоўнага героя, прымушаючы ўспомніць тое, што яму хацелася забыць, бо ён — ужо іншы. Мімаволі суперажываеш, бо герой аповесці намаляваны даволі рэалістычна і праўдзіва.

Апавяданні Раісы Дзейкун «Пахатніца» і «Суседзі-суседушкі» (пераклад на рускую мову аўтара) таксама вяртаюць у суровую рэчаіснасць. Творы — дакладнае і дэталёвае бытаапісанне сялянскага жыцця з яго зімовымі хатамі, замеценымі гурбамі, заўсёдным непаразуменнем, якое даводзіць да варожасці, нястачай нават самага неабходнага, што ўплывае на разуменне свету і робіць недарэчным нават саму ідэю жыцця ў спрыяльных умовах. Так, у «Пахатніцы» складаецца адзін з самых запамінальных і кранальных вобразаў — амаль нежывая вуліца, дзе на печах дажываюць сваё старыя.

Анатоль Бутэвіч (пераклад з беларускай мовы аўтара) прадстаўляе два апавяданні — «Пацалунак» і «Целагрэйка», прысвечаныя тэме кахання. Кахання менавіта з пункту гледжання пражытых гадоў, калі губляецца рэзкая пачуццёвасць, першаснасць эмоцый і катэгарычнасць, якая часта ўласцівая маладосці. Мэта аўтара — з дакладнасцю апісаць узаемадносіны, нібы тлумачачы, чаму атрымалася менавіта так, а не інакш. Цікава, што псіхалагізм будуецца не на простым пераказе таго ці іншага эпізоду, а дзякуючы развагам ад асобы жанчыны, якая вядзе ўнутраны маналог.

Казімір Камейша ў «А ў снежні тут зноў пабялела» (перакладчык з беларускай мовы Міхаіл Кулеш) разважае аб тым, што мінула і які гэта пакінула след: «…память горчит, как посыпана перцем». Аўтар імкнецца да апісання ўласнага ўнутранага свету, а таксама спрабуе зрабіць высновы, што дапамогуць ісці далей. Ды большасць твораў усё ж песімістычныя, што выклікае роздумы і мары.

Вельмі гучныя, недзе нават містычныя вершы Андрэя Скарынкіна «Я ірвуся на свабоду з цяжкіх аковаў». Аўтар звяртаецца да Бога і д'ябла, шукаючы выйсце, але дакладна ведаючы свой шлях. Вобразы смуты, пачвар, трагедый перамяжоўваюцца з больш рэальнымі, але не менш унушальнымі.

Аляксей Несцераў у нізцы «На ніве явы» — «ищущий, жаждущий в пустыне». Сутнасць свету ён выказвае ў наступным вершы:

Живое шевелится
Растет
Набирается сил
Пьет соки
Каменеет
Твердеет
И вот
Оно уже мертвое
Навеки

Звяртаючыся да міфалогіі і блукаючы ў ёй, аўтар стварае адметныя вобразы, нібы гуляючы з сімваламі.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Цуд у нечых вачах

Аўтары «Маладосці» ў апошнім нумары мінулага года ствараюць дзіўнае адчуванне зімы, «ссыпаючы на старонкі шмат-шмат сняжынак». І калі сапраўдная зіма ўжо адважылася прыйсці, то чаму б і мастакам слова не адгукнуцца на гэта? Што яны і робяць: не толькі па-снежаньску міла, але і па-студзеньску завейна. Нягледзячы на такую лёгкую і плывучую тэматыку нумара, часам аўтары звяртаюцца да чытача вельмі сур'ёзна.

Маладыя празаікі зазірнулі ў старыя альбомы і ўспомнілі час, калі верылася ў цуды. Невялічкае апавяданне Зараславы Камінскай «Калядны стол: некулінарная кніга» можна назваць гісторыямі-асацыяцыямі. Не ў кожнага яны могуць атрымацца цікавымі і адмысловымі, бо патрэбны сюжэты, што захопяць. Ды ў аўтара атрымалася — і без неверагодных фантастычных ідэй. Напрыклад, цікавая гісторыя пачынаецца з тлумачэння, як правільна есці варэнікі з чарніцамі, а завяршаецца значным для кожнай сям'і дыялогам пакаленняў — гераіні твора і яе бабулі. Ці напамін пра тое, як сорамна зашмат зразаць на бульбе, гародніне, што ў вайну магла пракарміць цэлую сям'ю. Або гісторыя прадавачкі, якая вечарамі праглядае чэкі, адгадваючы падзеі жыцця гаспадара чарговага чэка ў далёкай ці блізкай кватэры. Кожны сюжэт па-свойму арыгінальны і напісаны з такімі любоўю і натхненнем, што падкупляе адразу. А прачытваюцца гісторыі на адным дыханні.

Вольга Ліхадзіеўская ў творы «Шэсце» распавядае, як стварэнне навагодняй казкі можа ператварыцца ў звычайны, а часам даволі непрыемны элемент афіцыйных святкаванняў. Ды так, што такіх святаў не захочацца ні дарослым, ні дзецям, дзеля якіх, па сутнасці, усё і робіцца. Гераіня твора — настаўніца, якой даручылі ў час адпачынку выканаць ролю Дзеда Мароза на шэсці. Ды толькі касцюм аказаўся малаваты, было відаць звычайную вопратку. Настаўніца выканала просьбу, але колькі няёмкасці можа выклікаць такая сітуацыя. Ды для астатніх гэта наўпрост псаванне навагодняй атмасферы. Твор адметны тым, што на святы і жаданне цудаў можна паглядзець зусім інакш. Магчыма, гэта называецца «па-даросламу», але не бывае справы толькі ва ўзросце.

Галоўная гераіня ў апавяданні Кацярыны Захарэвіч «Упс» імкнецца верыць у казку, у магію звычайнага жыцця, але рэчаіснасць аказваецца не такая радасная і натхняльная: напружвае, заганяе ў тупік, палохае. Падлеткавая гісторыя веры ў незвычайнае завяршаецца вельмі рэалістычна, па сутнасці, як і пачыналася. Санька вяртаецца дадому пасля спаткання, так і не спазнаўшы, што такое ўзаемаразуменне. Менавіта гэтак руйнуецца вера ў чароўнае і пачынаецца так званы пераход у новае, дарослае, жыццё праз няёмкасць і расчараванне. Бо ці не лягчэй жыць без веры і спадзяванняў на нешта ці некага, акрамя сябе? Магчыма, ды толькі якое гэта жыццё?

Настасся Нарэйка ў апавяданні «Вазьмі сваю святцільню» набліжаецца да атмасферы казачнасці, якую часам так хочацца адчуць пад Новы год. Калі жыццё атручваюць пэўныя значныя абставіны ці малюсенькая дробязь — усё роўна, — асоба адкажа злобай. У Арыны з-за няшчаснага выпадку застаўся шрам на твары. Таму глядзець на сваю сястру-блізнятку ёй сорамна і прыкра, яна нікога не хоча бачыць. Але калі не людзі, дык цуд заўсёды падкажа і дапаможа рухацца наперад. Трэба толькі знайсці сваю святцільню, якая, няцяжка здагадацца, з'яўляецца метафарай усяго светлага на зямлі.

Працягваецца нумар паэзіяй, часткай ягой стаў «Фэст аднаго верша. Сны пад падушкай». Кацярына Тарасава, Стася Кацюргіна, Алена Масцерава, Анхела Эспіноса Руіз, Павел Дарохін, Анастасія Грышчук, Алесь Емяльянаў-Шыловіч, Дзмітрый Шулюк, Аляксей Арцёмаў, Галіна Сіўчанка кахаюць, чакаюць, разважаюць пра хуткаплыннасць і зменлівасць часу, шукаюць сябе ды радуюцца больш, чым сумуюць (што нават неверагодна) і, вядома, вераць у цуд.

У нумары — нізка вершаў «Тая мова» Галіны Сіўчанкі.

амшара журавінела барвова
ды слаўся чорна нечы непрацяг
у пустату дзе нікне зрок бяссільна
мне ж прозалаццю мроілася мова…

Такое вось атаясамленне станаў лірычнай гераіні і прыроды. Яны пераліваюцца з аднаго ў другі, утвараючы асаблівую «хаду» вершаў, якая падобна да плыні свядомасці.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Андрэй КОЗЕЛ

***

Палітра страчанага часу
мяне зацягвала адразу.
Змяняўся гукамі двубой,
што вёўся мной з самім сабой.

Бязмоўе страчаных імёнаў,
бязгучнасць вуснаў і праклёнаў,
маўчанне мараў ды ідэй.
Я быў агонь ці Праметэй?

Дажджу я верыў, верыў снегу,
бягом хадзіў, хадою бегаў.
Відушчым быў і быў як крот.
Ці свечка я або я кнот?

Спякоту мог адчуць марозам,
мог п'яным быць, хоць быў цвярозым.

А сонца месячным сяйвом
мне асвятляла шлях і дом.

Вясёлым быў той шлях маркотны,
і не сухі, зусім не слотны,
і не чужы, але не мой,
усё ж змаганне ці двубой…

Там супярэчнасцяў дарога,
дзе на Зямлі няма зямнога,
замнога рэчкі, мала мора,
дзе сябар сам сабе і вораг.

***

Што мне раскажуць пра цябе нябёсы?
Прашэпча ў парку сёння мне трава?
Пра што завые вецер невыносны?
Аб тым, што ёсць, чаго яшчэ няма?

Аб чым маўчыць зязюля? На паўслове,
жахлівым спыненая нечым, злым…
У той балеснай, збітай невымове
мне нават гук здаецца ўжо нямым.

Што мне раскажа змоўшчыца-лістота?
Чаму навучыць зноў сяброўка-ноч,
і лебяда, забытая ля плота,
бярозкі, клёны, што стаяць наўзбоч?

Чаму ручай бяжыць не гэтак звонка?
Ён бег калісьці для мяне інакш!
Бо быў празрысты і спяваў так тонка…
Цяпер жа бег яго складае марш.

Раскажа што забытая сцяжына —
сцяжына маіх мараў, явы, сноў?
Яе нібыта ліха абкружыла —
па ёй ніколі не прайсціся зноў.

І што прамень пабляклы скажа сонцу,
счарсцвелая самотная зямля? —
Героі хто на адзіноце-плёнцы,
звязаныя бязгучным целам дня?

Пра што пячэ мне водар жыта —
такога смачнага, духмянага раней?!
Жыццё падзелена — на «будзе»
і «пражыта»
мінулай чарадою непапраўных дзей.

Аб кім маўчыць паўсонная прырода,
у літаргічным спыненая сне?
А мне здаецца: кожнай парой года
яна прыціхла, змоўкла пра цябе.

***

Нам так лёгка было памыліцца
і так цяжка знаходзіць шляхі,
дзе б каханай абдымкаў напіцца —
у вачах паплылі каб кругі.

Скрухай проста напоўніць хвіліны
да сп'янелых пярэймаў тугі,
пах забыўшы, згубіўшы маліны,
што да вуснаў яе так маніў.

Прад паглядам каханай скарыцца,
слухаць шэпат ад крыку мацней:
з ім на ўсё можна ў свеце забыцца,
патануўшы ў глыбінях вачэй.

***

брату майму, Мікалаю

Я рыхтаваўся да вайны,
я клікаў хутка легіёны,
згадаўшы згубы злой бяды,
надзей падлічваў я патроны.

Я рыхтаваўся да вайны,
запасы поўніў веры воскам
і ліў бальзамы для душы
у чашы храма словам Боскім.

Я рыхтаваўся да вайны
лязо нажоў зачысціў срэбрам,
найлепш уцяміўшы тады,
што так, хутчэй за ўсё, і трэба.

Я рыхтаваўся да вайны,
лячыўся словам надта простым:
яго спявалі мне званы,
калі я плакаў перад войскам.

Я рыхтаваўся да вайны
і зваў сяброў на дапамогу.
Я рыхтаваўся… ну, а ты
знайшоў апошнюю дарогу.

Я рыхтаваўся да вайны.
Хоць і шукаў сабе спакою —
я ведаў, гэта назаўжды:
мая вайна з самім сабою.

Янка КАЛІНОЎСКІ

ФРЫДА

гэта сапраўдны боль
ён апаноўвае зноў
і зноў
ён становіцца звыклым сябрам
ён расцякаецца фарбамі
па мальберце схуднелага цела
пакуль здранцвелы
гарсэт сціскае паламаныя рэбры
вера
вера ў адданасць жыве
прымушаючы астатніх: «паверце»
апранаючы маску смерці
сустракаеш світанне
над балючым і стомленым светам
дзе ты, дзе ты
шчырасць і раўнавага
табе не патрэбна ўвага
ты патрабуеш фарбаў
яскравых
аддаючы перавагу
цыгарэтнаму дыму.
у тваім імені —
жарсць і мастацтва
(хтосьці зрыфмуе з вар'яцтвам)
я рыфмую з абсалютам
пакуты, ізноў пакуты
ізноў атрута
па ўсім схуднелым целе
ізноў снег у адчуванні
сцелецца
не праходзіць і не сціхае
мацней сціскае
гарсэт
не ўладны зрасціць у адзінстве пачуцці
гэты боль
больш
не адпусціць
адаб'ецца апошняй усмешкай
пакуль паліш без спешкі
апошнюю.

***

мне сёння сказалі
што птушкі
больш выразна спяваюць —
напэўна, гукаюць вясну.
я папрасіла, каб людзі
ў кавярні сцішыліся,
бо пэўна адбудзецца
нешта важнае і няўлоўнае,
нешта такое
што мае вушы
няздольныя пачуць.
яны няздольныя
адрозніць выразнасць птушыных
спеваў
на жаль
але душа адчувае спеласць
вясны і пачуццяў,
што прыйдуць.
сёння мне сказалі
што птушкі змянілі тэмбр.
ахвотна веру
веру і спадзяюся;
папрашу толькі: «людзі
ў кавярні, сціцце галасы».
не адбудзецца —
ўжо адбываецца
птушыным спевам
у нашых сэрцах,
мы па йнерцыі
пачынаем танчыць
танчыць пад птушыную выразнасць;
тут не месца абразам
горычы і слязам —
хіба слязам захаплення;
гэты вясновы матыў навеяны
свежай выразнасцю птушак.
сэрца ўзрушана
пяшчотай поўніцца.

***

тонкі вэлюм меланхоліі
прымушае выкруціць volume
на максімум
прымушае на волю
выпусціць нейкі фрустрацыйны ўздых
эмацыйны ўздым
а за ім — круты спуск
за ім спуск што не будзе націснуты
адсутнасць выбітнасці
адсутнасць адбіткаў
у чорных люстэрках
некранутыя ежай талеркі
пітвом не сапсаваныя кубкі
харчуешся толькі галівудскімі чуткамі
а потым ідзеш да гастраэнтэролага
і ў тваім некралогу будзе прысутнічаць
пустэча чорных адлюстраванняў
цёплая кроў у халоднай ванне
верагодна гэта ўсё эмацыйнасць
замест вянкоў абаўюць драцінай
замест катафалку павязуць ў аўтазаку
пры свеце поўні завые сабака
якога ты карміў паштэтам за два рублі
які з імпэтам слухаў твае верлібры
і еў
хіба ты быў камусьці патрэбны
нарэшце забудуць твой позірк ганебны
ўкапаюць глыбока ў глебу
у абдымках прывабнай Гебы
і накрыюць бязважкім вэлюмам
меланхоліі.

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

ЛЕТА НА ЛЕЦІШЧЫ

(вершы для Сымона)

***

Як гаварыў шчанюк у мульціку
аб патрулі,
мы дастаткова выраслі, каб не спаць
уначы.
Наш летні сон скралі ластаўкі
ды свіргулі
і нават Чып і Дэйл не здолеюць
дапамагчы.

Сонца на сонцавароце — распалены
белы пятак,
нібы мішэнь, у якую патрапілі
на біятлоне.
Б'ём свой леташні рэкорд па чарэшні
(няясна,
за што мы яго так).
Кожнае світанне з табою — палепшанае
сутонне.

***

Дваццатага ліпеня
Сымон аддзяліў дзень ад ночы
сказаў «ноч» — і стала ноч
сказаў «спаць» — і пачаў спаць
палюбіў насіць шапку, бо змог яе
вымавіць

Як мяса на косць
множны лік нарастае
на мову дзіцяці

***

Я перадам у спадчыну соль-ваду
і сырую бульбу, калі пакусалі восы,
мочкі вушэй і вострую бараду,
і чырвонае горла, калі па халодным босы.
Скаліёз улева і бубачку ад пісьма,
бо асадку сціскаю моцна паводле звычаю;
а болей нічога такога ў мяне няма:
астатняе гэта я ў цябе запазычваю.

***

Ліквідацыя наступстваў
страшнага сну
адбывалася паводле інструкцыі
былі высушаныя слёзкі
прагнаны Казёл
які хацеў з'есці дзядулю
налітае і выпітае
цёплае малако
заснулі абняўшыся
трымаючыся за ручкі
благаючы каб кашмары былі адзінымі
надзвычайнымі сітуацыямі

***

Бітва за ўраджай стаецца бітваю
з ураджаем.
Яблычнік — смак дзяцінства, калі б
не карыца.
Восы не джаляцца — не дазваляе Джа ім.
Цеста заўсёды надзіцца не паўтарыцца.

Разбіты гадзіннік у смецці — мінулы час.
Вечар у жніўні сімпатызуе льдзінам.
Новыя лямпачкі не чулі пра Ільіча.
Кожны пірог спрабуе застацца адзіным.

Нашае лета можна выкарыстаць
супраць нас,
заблакаваць нам пажарнае выйсце
з нірваны.
Разбіты гадзіннік яшчэ адлічвае час.
Мамін рэцэпт нідзе не занатаваны.

Фота Кастуся Дробава.

Ігар ПРАКАПОВІЧ

ТАЯМНІЧЫЯ ГІСТОРЫІ З КРАЯЗНАЎЧЫХ ВАНДРОВАК

ПАЙГРАЎ НА ВЯСЕЛЛІ

На ўскрайку Лынтупаў каля курганоў ляжыць Чортаў камень. У ім жыве нячысцік, які ладзіць людзям розныя кепствы.

Вяртаўся неяк раз адзін лынтупскі музыка дамоў з суседняй вёскі, у якой іграў вяселле. Нёс з сабой гармонік. Быў прытомлены, бо колькі дзён іграў танцы і маршы.

І вось ён выйшаў да таго каменя. А ўжо добра сцямнела. І нешта так музыку размарыла, так захацелася адпачыць, што ён сеў на траву, абапёрся спінай аб камень і заплюшчыў вочы. Не прайшло, здаецца, і хвіліны, як адчуў, што будзіць яго нехта, тузае за плячо. Расплюшчыў мужык вочы, глядзіць — аж перад ім нейкі невядомы гжэчны шляхцюк стаіць. У капялюшыку, чорным касцюмчыку, з адмысловай пугай у руцэ. Не бачыў музыка такога на вяселлі — там былі толькі простыя сяляне.

Працёр мужык вочы, а шляхцюк і кажа:

— І што ты тут разлёгся ля маёй хаты? Чаму не іграеш?

Агледзеўся мужык вакол — няма ніякай хаты, толькі камень, паляна ды рэдкія дрэвы, што асветлены месячным святлом.

— Найграўся, — кажа, — на вяселлі. Вось, паночку, прысеў адпачыць.

— Дык ты, хамло, халопам іграеш, а мяне ўважыць не хочаш!? Зараз і мы вяселле наладзім. Будзем вужа з жабай жаніць. Іграй!

Сказаўшы гэта, шляхцюк так сцебануў мужыка пугай па спіне, што аж кроў на вопратцы выступіла. Спужаўся музыка, падхапіў гармонік ды давай іграць. Як толькі расцягнуў мяхі, то адразу вакол загуло, зашамацела, зашыпела, заквакала. Глядзіць ён, аж з усіх бакоў на паляну перад каменем выпаўзаюць розныя гады, скачуць вялікія і малыя жабы, злятаюцца агромністыя жукі, матылі ды лятучыя мышы.

Жуда перапоўніла сэрца музыкі. Ён заплюшчыў вочы, каб не бачыць гэтых пачвар, і пачаў іграць як мага мацней, каб не чуць шыпення ды квакання. Так і адыграў, баючыся нават глянуць на тых, хто скакаў пад яго музыку, аж да раніцы. Толькі калі ў Лынтупах заспявалі пеўні, мужык адчуў, што на паляне пацішэла. Ён расплюшчыў вочы і агледзеўся. Плыў туман, пакрываючы буйнымі кроплямі расы стаптаную, здратаваную траву. «Можа, гэта быў сон?» — падумаў мужык. Але тут моцна засмылела спіна, і ён пабачыў пугу, якую нехта акуратна прыставіў да каменя...

ЛАСІЦКІ ПАЛАЦ

Той, каму даводзілася бываць на беразе Ласіцкага возера, напэўна, адчуваў у душы трывогу, трымценне, жаль, якімі набрыняла тутэйшая прастора. Неяк млосна робіцца чалавеку, няўтульна. Хоць і возера з выгляду прыгожае, і берагі прывабныя, але нейкай неўладкаванасцю, зацятай таямнічасцю павявае ад азёрнай расліннасці і хмызоў, што абхапілі азярцо, сціснулі яго шэра-зялёным колам. І ні будана, ні хаты на яго берагах няма: не захацелі тут людзі будавацца. Чаму? Ды ёсць прычына. Няўтульнае гэтае месца, трывожнае. Кажуць, што і цяпер, бывае, пойдзе хто адзін да возера… Ідзе сабе, ідзе, але раптам адчуе, што хтосьці быццам бы прыспешвае ззаду. Азірнецца чалавек і ўбачыць чарнявую маладую дзяўчыну. І не паспее яе добра разглядзець, як пачынае тая блякнуць, размывацца і ўрэшце сплывае воблакам уніз да Ласіцкага возера. І кідаецца тады чалавек назад наўцёкі, і маўчыць, стараецца нікому не расказваць пра гэта, бо ж засмяюць. Маўляў, людзі ў космас лётаюць, а тут — прывіды…

Але слабы смех… Нешта ўсё ж не тое робіцца ў гэтай мясціне. А старэйшыя жыхары вёскі прыгадваюць даўняе паданне, якое не толькі не супакойвае, але і яшчэ больш наганяе няўпэўненасці і трывогі.

Калісьці даўно на беразе возера стаяў прыгожы панскі палац з калонамі і тэрасай, якая вяла да самай вады. На тым месцы і зараз узвышаецца ладны ўзгорак, які парос высокай травой і здзічэлымі дрэвамі. Дык вось, у тым палацы жыў багаты і заможны пан. І меў ён прыгожую дачку — дзяўчыну з чыстай душой і адкрытым сэрцам. Яна вельмі любіла свае родныя мясціны, часта гуляла каля возера, сярод траў і садовых дрэў. Яна ведала амаль усе кветкі, пазнавала па спевах птушак, умела чытаць сляды звяроў. І вучылася дзяўчына не толькі ў прыроды, але і ў настаўніка, якога бацька спецыяльна для дачкі выпісаў з Францыі.

У пана справы ішлі добра, і ён цешыўся з жыцця і са сваёй дачушкі-прыгажуні.

Але аднойчы познім восеньскім вечарам, калі на вуліцы ліў дождж і вецер ламаў дрэвы, у дзверы палаца пагрукаў нейкі падарожны чалавек, папрасіўся абагрэцца і крыху абсушыцца. Шчыры гаспадар, да якога рэдка заязджалі вандроўнікі, бо палац стаяў воддаль ад дарогі, дазволіў яму не толькі спыніцца, але і пераначаваць. Той з дапамогай панскага лёкая завёў пару сваіх вараных коней у стайню, а потым вярнуўся ў палац, дзе яго ўжо чакала вячэра.

Нават у змрочным святле свечак нечаканы госць выглядаў непрывабна, нават агідна: кручкаваты нос, вялікія, круглыя вочы, збітыя ў каўтун валасы… Толькі багатая вопратка, ці то французская, ці то італьянская, выдавала яго заможнаць.

З'яўленне незнаёмца адразу ўнесла нейкі разлад у той размераны побыт, які існаваў шмат гадоў на сядзібе. Сабакі ў псярні, якія спачатку злосна брахалі на падарожніка, пачалі, падціснуўшы хвасты, танклява завываць. Кот, што звычайна грэўся на печы, ускочыў і імкліва сігануў у акно, выбіўшы шыбу і рассыпаўшы шкло ў друз. Салавей, які сядзеў у клетцы, пачаў спуджана біцца аб металічныя пруты і ў хуткім часе ўпаў нежывы.

Але гаспадары тады нічога не заўважылі.

За вячэрай госць шмат расказваў пра свае падарожжы па краінах Еўропы, пры гэтым амаль не зводзячы вачэй з панскай дачкі. Пад яго цяжкім паглядам яна то чырванела, то бляднела, і, нарэшце, адчуўшы сябе кепска, з дазволу бацькі пайшла ў свой пакой.

Гаспадар і госць пасядзелі яшчэ крыху, пакаштавалі слаўнага віна з панскай піўніцы і таксама сабраліся ісці спаць. Падарожнік, перад тым як адправіцца ў пакой для гасцей, папярэдзіў, што ён мусіць заўтра рана ад'ехаць. Пан загадаў слугам, каб разбудзілі госця да першых пеўняў.

Але на вуліцы па-ранейшаму ішоў праліўны дождж, у палацы было ціха і ўтульна, і лёкай праспаў.

Дом абудзіўся ад моцнага грукату. Было такое адчуванне, што з неба сыплецца каменне. Госць мітусліва апранаўся, крычаў на слуг, а калі на лямант выбег усхваляваны гаспадар, крыкнуў яму: «Твая дачка будзе маёй жонкай! Праз месяц я прыеду па яе! Рыхтуй вяселле!»

Выгукнуўшы гэта, госць бегма кінуўся з хаты і знік у залеве. Гул у небе пачаў сціхаць, а на раніцу спыніўся і дождж.

Дзяўчына праплакала ўсю ноч і ні на хвіліну не заснула — упершыню за ўсё жыццё ёй было страшна ў родным доме. А калі пачула, што гэты пачварны госць захацеў узяць яе ў жонкі, то самлела.

Пан загадаў лёкаю ехаць па доктара ў суседнюю вёску. Той кінуўся ў стайню, адчыніў дзверы і ледзь не аслупянеў. Там, дзе стаялі вараныя коні начнога госця, ляжалі два вялізныя валуны…

Калі дачка ачуняла, бацька пачаў думаць, што ж рабіць далей. Думкі блыталіся. Яшчэ б: за некалькі гадзін ледзь не разбурылася шчаслівае і спакойнае жыццё! А што будзе? Як будзе?

Пан паслаў ганца ў вёску Станелевічы па дзяўгунавайдэлота — мясцовага жыхара, які валодаў старажытнымі ведамі, што перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Той прыехаў верхам на кані, прывёз з сабой ягня, асінавы кій і лук са стрэламі. Спачатку дзяўгун пахадзіў вакол хаты, зазірнуў у стайню, прайшоўся па пакоях палаца, увесь час то нешта мацаючы, то прынюхваючыся. Потым пасярод дварышча расклаў лом. Калі вогнішча разгарэлася, схапіў лук і стрэліў чатыры разы: стрэлы паляцелі на ўсе бакі гарызонту. Потым зарэзаў ягня, кінуў яго на палаючыя дровы і пачаў прытанцоўваць. Увесь час ён штосьці нашэптваў. Гэта відовішча доўжылася ладны час, аж пакуль на месцы вогнішча не застаўся толькі гарачы прысак.

Тое, што распавёў гападару дзяўгун, дадало яшчэ больш сумятні і трывогі. «Гэта быў моцны цёмны вядзьмак. Яму тут спадабалася. Ён сюды вернецца, каб забраць дзяўчыну і ўсё багацце. Выйсце адно — прадаць палац, змяніць знешнасць і з'ехаць як мага падалей...»

Ад гэтых слоў пан аж анямеў. Кінуць гэты райскі куток? Прадаць палац? З'ехаць у невядомасць?.. А можа, начны госць больш не вернецца? Было ж усё добра... А калі вернецца? Што будзе з дзяўчынай?

Доўга думалі-гадалі бацька з дачкой і ўрэшце вырашылі так: дзяўчына паедзе далёка за мяжу, а бацька застанецца ў сваім палацы. Залатая каса была абстрыжана, валасы пафарбаваны ў чорны колер, а на левай шчацэ калёным жалезам выпалена невялічкая плямка.

Развітаўся бацька з дачкой у спадзяванні праз некаторы час зноў сустрэцца. Але не наканавана было гэтаму збыцца…

Роўна праз месяц зноў пайшлі моцныя дажджы, завыў-зароў вецер і ў дзверы палаца моцна пагрукалі. Лёкай не паспеў іх адчыніць, як яны, выбітыя неймавернай сілай, з трэскам разваліліся і ў пакой уварваўся раз'юшаны вядзьмак.

— Дзе яна? — злосна ці то правыў, ці то прашыпеў ён.

— Няма.. — дрыжучы і плачучы адказаў пан. Ён зірнуў у акно і аж здрыгануўся ад жаху: там пад дажджом, асветленая нейкім дзіўным водбліскам месяца, ашчэрыўшы пашчы, стаяла зграя вялізных ваўкоў...

Нешта незвычайнае пачало рабіцца ў палацы. Нябачная дзікая сіла ламала і крышыла мэблю, вырывала бярвенне са сцен, зрывала страху. Усё гэта, як лёгкія паперкі, адлятала ад будынка далёка-далёка, губляючыся ў начной цемры. На імгненне здалося, што ад прыгожага палаца застанецца толькі каменны падмурак. Але не! Тая ж дзікая сіла вырывала вялікія валуны з зямлі і раскідвала іх, як маленькія каменьчыкі, за дзясяткі кіламетраў ад былога палаца.

Мясцовыя жыхары кажуць, што каля ракі ў вёсцы Хрыстова ляжыць камень з панскага маёнтка. А ён немалы — каля двух метраў у даўжыню і столькі ж у шырыню. Крыху меншыя валуны захаваліся каля Ваўкоўскага возера на ўзгорку пад назвай Хабень, за вёскай Ваўкі ва ўрочышчы Цюханка і шмат дзе яшчэ.

Цяпер зразумела, чаму так няўтульна і трывожна на беразе таго возера Ласіца. І што гэта за чарнявая маладая дзяўчына, што з'яўляецца, бывае, на яго берагах…

Даўняя страшная гісторыя пра тое, як каля Ласіцкага возера цёмны вядзьмак разбурыў панскі палац, паціху забывалася. Месца, дзе стаяў той будынак, зарасло травой ды хмызамі. І хоць вакольныя краявіды вабілі сваёй прыгажосцю, ніхто з мясцовых жыхароў не адважыўся паставіць там сваю хаціну.

А ў канцы XIX стагоддзя рускі памешчык Якаў Малчанаў упадабаў тутэйшыя мясціны, купіў зямлю і паставіў каля возера невялікі маёнтак. Жыхары суседніх вёсак часта гаварылі пра тое, што нячыстая сіла не дасць спакою гаспадару, павінна паказаць сваю моц. Але час мінаў, і нічога страшнага ў маёнтку Малчанава не адбывалася. Відаць, забаялася тая нячыстая сіла прыгожай царквы, што была збудавана на ўзгорку ў вёсцы Ласіца. Яе залатыя крыжы бачныя здалёк.

Малчанаў быў жанаты на Марыі Дмухоўскай — жанчыне вельмі прыгожай, шляхетнай. Пазнаёміліся яны выпадкова ў цягніку і адразу патрапілі ў полымя гарачага кахання. Марыя была ўжо ўдавой, мела дачку, якая жыла ў Варшаве. Нягледзячы на каталіцкае веравызнанне, шлюб з Малчанавым яна замацавала ў Ласіцкай царкве.

«Пры Польшчы» быў выпадак, калі Малчанаў ледзь не стаў жабраком. Знайшоўся невядома адкуль чалавек (мо той самы вядзьмак), які падрабіў дакументы на маёнтак дзеля продажу за мяжу. Падман выкрыўся зусім выпадкова, калі гэты прайдзісвет зайшоў у гміну, каб канчаткова перааформіць дакументы. Але, кажуць, арыштаваць яго не ўдалося — уцёк, і яго больш ніхто не бачыў.

У 1939 годзе з прыходам савецкай улады чырвонаармейцы і мясцовыя сяляне разрабавалі палац Малчанава. Самога ж гаспадара ледзь не ўтапілі. Бядняк Сафрон, мясцовы жыхар, накінуў на Малчанава аброць і, як быдла, пацягнуў да возера. Аднак знайшліся людзі, якія не далі ўчыніць самасуд, заступіліся за памешчыка.

Але той маёнтак усё ж не датрываў да сённяшняга дня. Падчас Другой сусветнай вайны яго спалілі партызаны. Цяпер на тым месцы зноў растуць травы і хмызы, а ля возера часта перакочваюцца воблакі туману...

«ШТО МУСІЦЬ БЕРАГЧЫ КОЖНЫ НАРОД І ЧАЛАВЕК...»

(Рыгор Барадулін і Кыргызстан)

Чытаю ў дзённіку народнага паэта Беларусі за 6 кастрычніка 1990 года: «Сямён Саламонавіч (Элькінд) здабыў мне білет у Кіргізію, лячу на юбілей класіка…» І яшчэ — запіс ад 11 кастрычніка: «У Ленінцы заказаў Асмонава, трэба ехаць на 75-годдзе ў Фрунзе…» Алыкул Асмонаў (1915—1950) — кыргызскі паэт, драматург, перакладчык, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Кіргізскай ССР (1950, узнагарода прысуджана пасмяротна). У Кыргызстане імя Алыкула Асмонава носіць Нацыянальная бібліятэка. У вёсцы Каптал-Арык заснаваны музей паэта. Дом-музей Алыкула Асмонава ёсць і ў Бішкеку. Школа-гімназія № 68 Бішкека носіць імя Алыкула Асмонава… Пра паэта і сёння пішуцца кнігі, здымаюцца фільмы…

18 кастрычніка Рыгор Іванавіч Барадулін запісвае: «Самалёт сеў у аэрапорце Манас. Адразу згадаўся рымскі Леанарда... уладкаваўся ў саўмінаўскую гасцініцу "Іссык-Куль"… З Кенешам (Жусупавым) заходзілі ва ўтульную шатрападобную чайхану. Нацыянальныя стравы, зэдлічкі нізкія. Заходзяць маладыя, іхняя памяць продкавая нешта роднае ўспамінае».

19 кастрычніка гасцей вязуць на могілкі… «Былі на магіле Алыкула Асмонава. Сціплы помнік добраму паэту, не аблашчанаму савецкай уладай. Як у Літве Кудзірку. Усклалі кветкі. Прамовы. Потым усе сядзелі на кукішках, адзін нехта прачытаў малітву…»

І яшчэ адзін запіс — відаць, з прамовы Рыгора Барадуліна на могілках: «На свой юбілей нас усіх запрасіў сваім вечным словам верны сын Кіргізіі Алыкул Асманаў. Так у Расію запрашае Пушкін, у Беларусь — Янка Купала. І гэтакае запрашэнне слова паэтаў болей аб'ядноўвае нас, чым заканадаўчыя акты і ўказы, падмацаваныя сілай арміі і міліцыі. Кожны народ вольны сам выбіраць, дзе яму жыць і з кім дружыць. Адзінае, што мусіць берагчы кожны народ і чалавек, — сваю мову, сваё роднае, крэўнае, спрадвечнае».

Кыз кумай,
кыз кумай,
кыз кумай —
На кані дагані дзяўчыну.
Еш салому, фасон трымай.
Быць усё мусіць чын па чыну.

Кыз кумай —
як прыцмок бізуна.
Паскакала адна дзяўчына,
Як танюткая лазіна,
Быццам са смаляка лучына.

Выгінаецца ўся й гарыць
І назмаш бізуном сцябае.
Пацалункам яе скарыць
Цельпуку надзея слабая.

Кпіць па часе вясёлы час,
Бізуном перапсюрыўшы спіну,
І, кіруючы ў дамавіну,
Цвеліць палам кожнага з нас:
Дагані, дагані дзяўчыну…

Гэты верш Рыгор Барадулін дакладна «прывёз» з Кыргызстана. Чытаем у дзённікавых запісах ад 20 кастрычніка: «Усё пераблыталася, ноч з днём, дзень з ноччу. Сёння едзем на радзіму Алыкула Асмонава…» Мо і пісаліся, занатоўваліся радкі верша ў Кыргызстане?..

…Вёска Каптал-Арык. Музей у гонар «сонца кыргызскай паэзіі» (так называюць Алыкула Асмонава) заснавалі якраз тады, у дні святкавання 75-годдзя паэта. Слова — Рыгору Барадуліну: «На ўзвышэнні адкрыццё помніка, мітынг, адкрыццё музея Алыкулу. Далі запрашальныя білеты, дзе памечана, хто ў якой юрце. Мне далі 4-ую юрту, як нумар у гатэлі. Там папаска. Конныя скачкі. Дагані дзяўчыну. Схапі манету. На скаку трэба ўхапіць завязаную ў чырвоную анучку манету. Малыя хлапчукі — забег, хто першы разразае путы двухгадоваму хлапчуку, каб той бегаў. Сімвалічнае разняволенне. Па мацюгальніку выступаюць гумарысты. Імітуюць Гарбачова па-руску і свайго ішака з ЦК па-кіргізску. Гэта ўжо зрухі перабудовы…»

Тры дні правёў Рыгор Барадулін у Бішкеку, Кыргызстане. Адкрыў для сябе не толькі паэта, але і яго родныя мясціны разгледзеў, паспрабаваў унікнуць у сутнасць яго, Алыкула Асмонава, вялікіх і малых паэтычных адкрыццяў.

Рыгор Барадулін — вандроўнік па ўсіх цэнтральнаазіяцкіх краінах. Ён быў і ў Туркменістане, і ў Таджыкістане, Узбекістане… Яго нават помняць і цяпер у тых далёкіх ад Беларусі куточках. Расказваў нядаўна Ганад Чарказян: «Прыехаў на міжнародную канферэнцыю ў Ташкент. На ўрачыстай вячэры, дзе поўна было не толькі прысмакаў, гасцінцаў, але і паэтычнае слова дзе панавала, патрапіў за адзін дастархан з трыма народнымі паэтамі Узбекістана адразу. Як даведаліся, што я — курд беларускі, прыехаў з Мінска, адзін з іх адразу пра сваю дружбу з Барадуліным пачаў расказваць…» А ў Душанбэ заўжды беларусам пра свае пераклады паэзіі Рыгора Барадуліна расказвае народны паэт Таджыкістана Саідалі Мамур. У Кыргызстане пераклаў параўнальна нядаўна вершы Рыгора Барадуліна на рускую мову народны паэт Кыргызстана Вячаслаў Шапавалаў. І такія прыклады можна множыць.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Прысутнасць у літаратурнай прасторы суседзяў

Напрыканцы мінулага года ў Івана-Франкоўску (Украіна) пабачыў свет зборнік вершаў беларускага пісьменніка Міколы Адама «Під лацканами споминів» («Пад лацканамі ўспамінаў»). Пераклад ажыццявіла ўкраінская пісьменніца Марыя Вайно, з творчасцю якой чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца дзякуючы публікацыі яе навел у часопісе «Полымя». Яна ж напісала і прадмову да кнігі.

Прэзентацыя зборніка адбылася ў абласной навуковай бібліятэцы Івана-Франкоўска. Па словах самой Марыі Вайно, з'яўленне кнігі «засведчыла прысутнасць беларускай паэзіі ва ўкраінскай літаратурнай прасторы». Літаратуразнаўца Марта Хораб адзначыла: «Перакладчыца вельмі ашчадна паставілася да арыгінальнага стылю аўтара, яна захавала рытміку і пабудову вершаў, што вельмі важна». Было падкрэслена, што паэтычная творчасць Міколы Адама — надзвычай цэласная і арганічная, яму ўласцівая гранічная шчырасць.

Адметна, што выданне было ажыццёўлена пры актыўнай падтрымцы гарадской адміністрацыі і пісьменніцкай суполкі Івана-Франкоўска. На імпрэзе панавала цёплая лірычная атмасфера. Прысутныя дзякуючы скайп-канферэнцыі змаглі пабачыць Міколу Адама і пачуць ягонае прывітальнае слова. Выступалі паэты Багдан Кірста, Аляксандр Букацюк, Наталля Дзіціняк, Вікторыя Шэвель ды іншыя.

Выхад зборніка запачаткаваў серыю «Сучасная беларуская паэзія», дзякуючы якой украінскія чытачы будуць знаёміцца з творчасцю нашых пісьменнікаў.

Янка ЛАЙКОЎ

Балкарцы прачытаюць Максіма Багдановіча на роднай мове

У Нальчыку (сталіца Кабардзіна-Балкарыі) выходзіць кніга беларускай паэзіі і прозы на балкарскай мове. Балкарцы (іх у свеце крыху болей за 60 тысяч) прачытаюць на роднай мове вершы Максіма Багдановіча. І не толькі.

Анталогію з твораў беларускіх пісьменнікаў розных пакаленняў склаў выдатны балкарскі паэт і перакладчык, вядомы ў Кабардзіна-Балкарыі арганізатар выдавецкай справы Саліх Гуртуеў.

— Я назваў кнігу-сустрэчу з беларусамі «Мае беларускія госці», — расказвае пісьменнік з Нальчыка. — Госць — самы дарагі чалавек у балкарцаў, на Каўказе. Для госця мы гатовы зрабіць неймаверна шмат, каб ён палюбіў наш край, нашу старонку, знайшоў прыцягальныя адметнасці. І зараз я запрасіў у якасці гасцей у нацыянальны свет балкарцаў, паяднаўшы беларускі і балкарскі мастацкі свет, Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Кандрата Крапіву, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанку, Аляксея Пысіна, Уладзіміра Караткевіча, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна. Знайшлося месца на старонках кнігі перакладаў, якую я рыхтаваў досыць працяглы час, і сучасным беларускім пісьменнікам. У зборнік увойдуць мае пераклады паэзіі і прозы Навума Гальпяровіча, Тамары Красновай-Гусачэнкі, Міколы Мятліцкага, Віктара Шніпа, Алеся Бадака, Людмілы Рублеўскай, Таццяны Сівец, Юліі Алейчанкі, Алёны Стэльмах, Іны Фраловай, Валерыі Радунь. З вялікай цікавасцю працаваў над перакладамі ўрыўка з рамана Мікалая Чаргінца, апавядання Алега Ждана. Спадзяюся, што ў гэтай аўтарскай анталогіі перакладаў будзе свой чытач. Дзякуй усім беларусам, хто нешта падказваў мне, хто дапамагаў падбіраць творы для перакладу!

Кніга перакладаў Саліха Гуртуева «Мае беларускія госці» павінна пабачыць свет у студзені 2019 года.

Дарэчы, трэба заўважыць, што ў апошнія некалькі гадоў кнігі беларускіх пісьменнікаў (як аднаго аўтара, так і калектыўныя) пабачылі свет у Чэхіі, Славакіі, Сербіі, у рэгіёнах Расійскай Федэрацыі — Татарстане, Калмыкіі, Чачэнскай Рэспубліцы.

Сяргей ШЫЧКО

Майроніс па-беларуску

Кніга вершаў славутага літоўскага паэта Майроніса ў перакладзе на беларускую мову падрыхтавана да выдання ў Вільнюсе. Ініцыятар гэтага кніжнага праекта — літоўскі дзіцячы пісьменнік, перакладчык Вітаўтас Жэймантас, які да ўсяго яшчэ з'яўляецца і членам Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Ідэя выдання, як расказвае сам спадар Жэймантас, нарадзілася ў яго ў Мінску, калі ў 2017 годзе Выдавецкі дом «Звязда» правёў круглы стол па пытаннях беларуска-літоўскіх літаратурных стасункаў. Тады да размовы далучыліся дырэктар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» публіцыст Мікалай Супрановіч, паэт і перакладчык Алесь Бадак, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі, паэтэса Юлія Алейчанка, намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Юрый Хмыроў. Ад Літвы ўдзельнічалі аташэ па культуры Пасольства Літвы ў Беларусі спадар Міндаўгас Габрэнас, дырэктар выдавецтва «Тры зорачкі» Яронімас Лауцюс і сам Вітаўтас Жэймантас. У час правядзення круглага стала прагучалі і вершы Майроніса ў перакладзе на беларускую мову Юліі Алейчанкі, Яны Явіч, Вікторыі Радунь-Саротнік.

«З перакладчыцамі і пачалося найперш маё абмеркаванне тэмы выдання Майроніса па-беларуску, — гаворыць Вітаўтас Жэймантас. — У Вільні кансультантам маіх клопатаў па перастварэнні спадчыны літоўскага класіка на мову Купалы стала добры знаўца беларускай літаратуры спадарыня Альма Лапінскенэ. Яна нагадала, што Майроніса раней перакладаў на беларускую мову Рыгор Барадулін, і дапамагла знайсці публікацыі гэтых перакладаў…»

Цяпер кніга Майроніса «Вянок з руты» — на літоўскай і беларускай мовах — падрыхтавана да друку. Перакладчыкі Юлія Алейчанка, Валерыя Радунь-Саротнік, Яна Явіч, Рыгор Барадулін. У дадатак да твораў самога класіка ў выданне ўвайшлі прадмова В. Жэймантаса, а таксама рэпрадукцыі выяў розных гісторыка-літаратурных матэрыялаў, прысвечаных жыццю і творчасці Майроніса. Ёсць спадзяванне, першыя прэзентацыі кнігі пройдуць на кніжных выстаўках-кірмашах у Мінску і Вільнюсе ўжо на пачатку 2019 года.

Сяргей ШЫЧКО

Конкурс «УРОКІ СУЧАСНАСЦІ»

Мінск: нясумны маршрут

Кожны настаўнік марыць, каб на яго занятках вучні працавалі добраахвотна, з цікавасцю, творча. Бо зацікаўленасць — асноўны стымул дзейнасці. Вучань адкрывае для сябе новыя факты, з'явы, педагог вядзе па шляху адкрыцця, кіруе праблемна-пошукавай і даследчай дзейнасцю. Задача настаўніка (на мой погляд) заключаецца ў тым, каб зацікавіць вучняў, выклікаць радасць самастойнага адкрыцця, але пры гэтым, самае галоўнае, каб вучоба не ператваралася ў забаву або гульню. Як зрабіць, каб не згасла імкненне да ведаў? Для мяне выдатным рашэннем стала тэхналогія праектаў, элементы якой дазваляюць не толькі ўспрымаць матэрыял з цікавасцю, але і самому быць удзельнікам працэсу.

Да таго ж не рознабаковасць праектнай дзейнасці дазваляе знайсці свае разыначкі, якія спрыяюць самавыяўленню вучняў, раскрыццю іх творчага патэнцыялу, крэатыўнасці.

На працягу трох апошніх гадоў сумесна з вучнямі актыўна выкарыстоўваю тэхналогію праектаў, што ўключае праблемнае навучанне, дыферэнцаваны падыход, методыку супрацоўніцтва. Яна дазваляе ператварыць вучэбныя заняткі па беларускай літаратуры ў творчыя майстэрні, дзе вырашаюцца цікавыя, практычна значныя і даступныя для вучняў праблемы. Гэты метад — сукупнасць даследчай, пошукавай, праблемнай работы, творчай па сваёй сутнасці.

На пачатку работы над пэўным праектным заданнем разам з вучнямі прадумваем, які праект па характары дзейнасці будзе выбраны для рэалізацыі: даследчы, прыкладны (практыка-арыентаваны), інфармацыйны, творчы.

Каб вучні актыўна ўключаліся ў працу, ствараю праблемную сітуацыю, якая будзе спрыяць фармуляванню актуальнай і цікавай тэмы для вывучэння або даследавання, даю магчымасць самастойна рэалізаваць праект, потым разам размяркоўваем ролі паміж вучнямі. Дапамагаю ажыццявіць пошукавую ці даследчую дзейнасць, кансультую на ўсіх этапах дзейнасці, арганізоўваю падвядзенне прамежкавых вынікаў. Вучні самастойна ацэньваюць сябе і сяброў, калі ёсць патрэба, сумесна ладзім прэзентацыю.

Асобна патрэбна сказаць пра арганізацыю знешняй ацэнкі праектаў. Такая ацэнка дапамагае адсочваць эфектыўнасць, збоі, праводзіць своечасовую карэкцыю.

Вынікі можна прадставіць як навуковы даклад, дзелавую гульню, экскурсію, канферэнцыю, інсцэніроўку, спектакль, падарожжа, рэкламу, рэферат, прэзентацыю і інш.

Як прыклад — праект «Мінск літаратурны». У нашым дынамічным свеце асаблівую актуальнасць набываюць праблемы гуманітарнага жыцця грамадства. На ўроку было ўзнята пытанне пра цікавасць моладзі да беларускай літаратуры. У выніку ўрок прайшоў у фармаце дыскусіі, што пацвердзіла актуальнасць праблемы. Чаму вучні не хочуць чытаць? Як заваладаць увагай чытачоў? Зрабіць нешта неверагоднае! Матэрыялізаваць тое, што дагэтуль не было адчувальным. Напрыклад, змест кніг. Запрасіць у інтэрактыўныя прыгоды па кніжных старонках (праводзіўся квэст). Ці, напрыклад, выдаць карту падарожжа па літаратурных мясцінах Мінска і г. д. Да ідэі праекта падштурхнула і тое, што жыхарам і гасцям горада прапаноўваюцца экскурсіі «Мінск спартыўны», «Мінск тэатральны», «Мінск партызанскі» і г. д. Чаму не можа быць «Мінска літаратурнага»?..

Для масквічоў вельмі важная «нядобрая кватэрка» з рамана Міхаіла Булгакава, для лонданцаў — пакой Гары Потэра, для стакгольмцаў — дах, на якім жыў Карлсан, для вяронцаў — грабніца Джульеты. Ёсць і ў беларускай сталіцы месцы, апісаныя ў вядомых творах. Але перш чым пачаць работу над праектам, мы правялі апытанне ў сацыяльнай сетцы «УКантанце» *(Малюнак 1)*, каб даведацца, колькі чытаюць вучні, якую літаратуру выбіраюць (айчынную ці замежную), як можна зрабіць беларускую літаратуру больш папулярнай.

— 77 % вучняў чытаюць мастацкую літаратуру, 17 % — не чытаюць, ніколі не бяруць ў рукі мастацкую літаратуру — 6 % вучняў. Большая палова вучняў чытае кнігі ў электронным варыянце (67 %).

— Замежную літаратуру (у першую чаргу рускую) чытаюць 73 %, беларускую — 14 %.

— На думку нашых вучняў, зрабіць беларускую літаратуру больш папулярнай маглі б новыя падыходы да знаёмства з літаратурай у школе (49 %), цікавыя аўтары і творы (30 %).

— У выніку 87 % зацікавілася экскурсіяй па літаратурных месцах Мінска як формай знаёмства з літаратурай.

З мэтай папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і творчасці айчынных пісьменнікаў, папулярызацыі чытання сярод вучняў мы распрацавалі літаратурны экскурсійны маршрут (Літаратурная карта Мінска).

Маршрут прадстаўлены наступным чынам:

Электронны варыянт (Малюнак 2). На *Google*-карце ўказаны месцы, якія апісваюцца ў творах беларускай літаратуры, а таксама месцы жыхарства беларускіх пісьменнікаў; калі вы клікніце на маркер (кніга ў чырвоным крузе), то ўбачыце, на якую вуліцу трэба ісці і спасылку, якая дазволіць пазнаёміцца з творам або творчасцю беларускага пісьменніка.



Малюнак 2. Google-карта з літаратурнымі аб'ектамі (чырвоны круг з белай кнігай).

Друкаваны варыянт. На раздрукаванай карце пазначаны месцы, якія апісваюцца ў творах беларускай літаратуры, месцы жыхарства беларускіх пісьменнікаў; пададзены *QR*-коды, дзякуючы якім неабавязкова браць з сабой кнігу з творам. Дастаткова дастаць з кішэні мабільны тэлефон або планшэт і адсканаваць *QR*-код. Твор ці звесткі пра айчынных пісьменнікаў будуць даступныя ў мабільным тэлефоне праз некалькі секунд.

На цяперашні момант распрацавана літаратурная карта, экскурсійны маршрут, якія дазваляе прадэманстраваць сучасныя падыходы да чытання і вывучэння літаратурнага твора і дзейнасці беларускіх пісьменнікаў — праз праекцыю на прастору. Электронная і друкаваная карты даюць магчымасць індывідуальна прайсціся па літаратурным маршруце. Калі ж вы хочаце праслухаць дадатковыя звесткі пра гісторыю напісання твора, пра аўтара і яго герояў, то мы чакаем вас на экскурсію з гідам.

Дзякуючы звароту да сучасных тэхналогій, сёння нашмат прасцей пазнаёміцца з грамадскай дзейнасцю айчынных пісьменнікаў, а таксама з іх літаратурнай спадчынай, уздымаецца патэнцыял асветніцкай і арганізацыйнай дзейнасці, накіраванай на фарміраванне культурнай самасвядомасці. Акрамя таго, картаграфічнае адлюстраванне літаратурных матэрыялаў зручнае для выкарыстання на ўроках літаратуры, гісторыі як нагляднага матэрыялу.



Малюнак 1. Апытанне вучняў у сацыяльнай сетцы «УКантакце».

Таццяна КАНДРАШОВА,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры I кваліфікацыйнай катэгорыі сярэдняй школы № 178 г. Мінска імя Т. А. Лук'яновіча

На асабістым складзе змены ў асабовым складзе

Калі бачыш бэзавыя кусты ў батанічным садзе, разумееш, што ўсе яны вельмі падобныя, але кожны з іх мае свае адметнасці і ўспрымаецца па-свойму.

Так і з мовай. Некалькі слоў, утвораных ад аднаго кораня, праз адмысловыя марфалагічныя сродкі адрозніваюцца значэннем і знаходзяць сваё месца ў парадыгматыцы і сінтагматыцы. Усведамляць гэтае месца — значыць арыентавацца ў складаным моўным лабірынце і ўмець вывесці «на свет цэлы» патрэбнае слова дзеля выказвання думкі.

Але што рабіць, калі пэўнае месца лексемы не вызначана нават самім аўтарам? Дапамагаць, вучыць, а не тыражаваць недакладна выказаныя думкі на шырокую аўдыторыю. Бо паронімы (ад *грэч. para* = каля, побач + *onima* = імя) — словы, падобныя напісаннем і вымаўленнем, але розныя значэннем, — парушаюць сэнсавы бок вербальнага масіву, уводзяць чытача ў зман.

Здавалася б, такія простыя прыметнікі *асабісты* і *асабовы*, але да сёння сустракаем у тэкстах сказы накшталт: «Адмірал уласным прыкладам натхняў *асабісты* склад на подзвігі». *Асабісты* чытач успрымае як 'свой', 'уласны', а не як 'склад асоб', таму цалкам магчыма, што ў адмірала быў «уласны склад», а гэта памылковая думка (трэба: *асабовы склад*). Або іншы выпадак: «Хлопчыкі і дзяўчынкі змагаліся за *асабовы* вынік». Тут якраз трэба выкарыстаць *асабісты*, г. зн. за «ўласны».

Варта завастрыць увагу і на тым, што апошнім часам замест канструкцыі «асабовы склад» пашыраецца выкарыстанне выразу «асабовы састаў», чаго раней практычна не было. Гэта — яскравы прыклад нематываванага калькавання ў сітуацыі двухмоўя.

А *дзейсны* і *дзейны*? Першы прыметнік паводле значэння не можа дапасоўвацца да асабовых назоўнікаў, а ў сказе знаходзім: «У адрозненне ад апатычнага Кавылька, гэты персанаж больш *дзейсны*» (трэба: дзейны). Параўнаем: «Якуб Колас паабяцаў самую *дзейсную* дапамогу».

Часта ўзнікае пытанне: ці ёсць у мове словы-паронімы *згадаць* і *ўзгадаць*? Зазірнуўшы ў слоўнік, мы не знойдзем другога слова. Прычына яго наяўнасці ў мове, верагодна, жаданне замяніць *успомніць* (мае прыстаўку *ўс-*, параўн.: *прыпомніць*). У слове ж *згадаць* — прыстаўка *з-* (параўн.: *прыгадаць*), а не *ўз-*. Дастаткова прывесці класічныя радкі Максіма Багдановіча: «Зорка Венера ўзышла над зямлёю, / Светлыя *згадкі* з сабой прывяла...» Таму неабходна карпатліва вылоўліваць такія памылкі, як у сказе: «Вяртаючыся да гісторыі з Пандорай, варта *ўзгадаць* і канцоўку міфа» (трэба: *згадаць* ці *ўспомніць*).

Іншыя прыклады з публіцыстычнага стылю таксама сведчаць пра распаўсюджанасць памылак на ўжыванне паронімаў: «*Камандзіровачныя* памятаюць скрыпача, што сустракаў з музыкай рэйсавыя аўтобусы» (трэба: *Камандзіраваныя*); «Калі ж апарат не мае ў сілу *канструктыўных* асаблівасцей такога табло, то ён павінен быць устаноўлены для візуальнага прагляду пакупніком самога апарата» (трэба: *Калі ж апарат не мае такога табло ў сілу канструкцыйных асаблівасцей...*); «...зніжаецца колькасць выпадкаў адкрытага *аператыўнага* ўмяшання пры лячэнні мочакаменнай хваробы» (трэба: *аперацыйнага*).

Марфема ў структуры слова можа паказваць толькі яго граматычнае значэнне (канчатак *-і* ёсць паказчыкам множнага ліку слова *цэхі*). Але больш важныя тыя марфемы, што маюць лексічнае значэнне, і непавага да гэтага аспекту аналізу выклікае прыкрыя хібы, якія ўплываюць на ўспрыманне твора чытачом. З гэтай прычыны вынесеная ў загаловак канструкцыя мае поўнае права на існаванне: напрыклад, пэўны прадпрыемец на *асабістым* складзе аўтамабільных запчастак вырашыў павялічыць колькасць працаўнікоў — змяніць *асабовы* склад.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

мастацкія практыкі

Алена РУСАКЕВІЧ

ПРА СТАНКОВЫ ЖЫВАПІС У СУЧАСНЫМ МАСТАЦТВЕ БЕЛАРУСІ

Станковы жывапіс даволі доўгі час меў асаблівае значэнне і займаў значнае месца ў выяўленчым мастацтве. Сама канцэпцыя гэтага віду мастацтва прадугледжвае адмову ад прывязкі да асяродка і поўную аўтаномнасць. Тым не менш гэта канцэпцыя мела заўсёды па большай частцы ўтылітарную функцыю. Выява розных сюжэтаў на плоскасці служыла ўпрыгожваннем інтэр'ера, паказчыкам статусу, інфармацыйным рэсурсам, атракцыёнам і г. д.

Ліквідацыя старых традыцый у мастацтве стала адным з маркераў сучаснасці. Узнікненне новых філасофскіх канцэпцый і развіццё тэхналогій цягне за сабой развіццё новых відаў мастацтва. І варта адзначыць, што з ходам часу абставіны паварочваюцца не на карысць станковага жывапісу. Бо татальныя інсталяцыі, відэа-арт і перформансы часта больш эфектныя і выклікаюць большую цікавасць.

Беларускі станковы жывапіс заўсёды стараўся адпавядаць павевам часу. Але большасць сучасных жывапісцаў хаваюцца ва ўласную ракавіну, аддаючы перавагу правераным часам тэмам і жанрам. Найбольш смелыя аўтары працягваюць актыўна карыстацца сродкамі мастацкай выразнасці, характэрнымі для эпохі мадэрнізму. Нейкая, магчыма, падсвядомая закамплексаванасць перад іншымі відамі мастацтва прымушае сучасных жывапісцаў перабольшваць некаторыя з мадэрнісцкіх жывапісных прыёмаў (перанасычаць твор фактурамі, выкарыстоўваць неапраўданую колькасць знакаў і сімвалаў, максімальна скажаць форму і г. д.) або кампенсаваць недахоп ідэйнага зместу вялікім фарматам.

Няхай у некаторых колах і карыстаецца попытам мастацтва падобнага кшталту, але ў цэлым такое пустэльніцтва аўтараў не заўсёды ідзе на карысць сучаснаму станковаму жывапісу. Зварот мастакоў да традыцыйных або так званых адвечных сюжэтаў у апошні час ператварыўся проста ў ветлівы жэст. У такой сітуацыі практычна няма месца шчырым перажыванням і жаданню данесці пэўную ідэю — застаецца толькі гульня з формай. Гэты своеасаблівы сучасны «маньерызм» спараджае нездаровую колькасць псеўдаўзвышаных сюжэтаў і шараговага інтэр'ернага жывапісу.

Сакральнае стаўленне мастакоў да гэтага віду мастацтва, здаецца, не дазваляе яму развівацца. Знарочыстая кансервацыя і, як вынік, перажоўванне адных і тых жа тэм і мастацкіх прыёмаў зніжае статус станковага жывапісу ў полі актуальнага мастацтва Беларусі. Ці сучасныя жывапісцы не жадаюць прызнаваць, што сучаснае мастацтва прадугледжвае розныя творчыя падыходы?

Гэта не заклік да адмовы ад станковага жывапісу. Яго не варта жыўцом хаваць або ні з таго, ні з сяго актыўна адраджаць. Можна проста паспрабаваць выйсці з замкнёнага кола, актуалізаваўшы тэмы і мастацкія прыёмы. Бо інклюзіўнасць гэтага віду мастацтва ў катэгорыю актуальнага можа быць дасягнута толькі пры ўмове прыняцця сучаснымі аўтарамі сучасных мастацкіх і філасофскіх прынцыпаў.

З НАРОДУ, З НАРОДАМ, НАРОДНЫ

80 гадоў жыццёва-творчага суладдзя Васіля Шаранговіча



«Вясковая царква». Акварэль. 2005 г.

Некалькі гадоў таму на выстаўцы, дзе экспанаваліся ілюстрацыі да «Новай зямлі» Якуба Коласа, была наладжана сустрэча юных мастакоў з аўтарам Васілём Пятровічам Шаранговічам у Музеі сучаснага беларускага мастацтва. Яго стварыў і першым дырэктарам быў Васіль Шаранговіч. На сустрэчы ў Музеі каля такіх жывых, рэальных беларускіх вобразаў неяк асабліва востра адчулася, што Васіль Шаранговіч, бадай, — адзін з апошніх, хто не проста бачыў, а ўмее карыстацца ўсімі сялянскімі прыладамі працы, якія згадвае ў «Новай зямлі» Якуб Колас. І тыя, хто толькі пачынаў свой шлях у мастацтве, адчуваючы гэта, уважліва слухалі, задавалі пытанні, нават нешта замалёўвалі. А Васіль Пятровіч гаварыў і гаварыў, натхнёна, эмацыянальна, вобразна… Гэта была яшчэ адна «Новая зямля». «Новая зямля» Васіля Шаранговіча.

Кажуць, дзяцей знаходзяць у капусце. Васіль Шаранговіч нарадзіўся у вёсцы Качаны ля Мядзеля, у найпрыгажэйшых паэтычных мясцінах, у сям'і каваля і аратая. Для мяне асабіста шэра-блакітныя вочы мастака — згадка пра тутэйшыя азёры. Не, не пра лагодную празрыстую ваду, а пра трывожныя, са сталёвым адлівам, хвалі, што імкліва набягаюць адна на адну… «Дзеці вайны» — з такім азначэннем увайшло ў гісторыю пакаленне Васіля Шаранговіча.

«Многія эпізоды так рана ўрэзаліся ў памяць, што пасля вайны ўсё гэта мне тады-сяды здавалася сюррэалістычным сном або дзіцячымі фантазіямі...» — прызнаецца мастак у аўтабіяграфічнай аповесці «Ген жыцця».

Так, сапраўды, у творах Васіля Шаранговіча пра вайну нясцерпна, балюча гучыць сюррэалістычная нота…

А чалавек прагне гармоніі, высакароднасці, чысціні. І гэтая музыка перамагае. І ў краявідах, і ў партрэтах, і ў ілюстрацыях да «Новай зямлі» Якуба Коласа, і ў ілюстрацыях да «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча. Мне здаецца, невыпадковым было вельмі шчырае сяброўства Васіля Шаранговіча з нашым выдатным археолагам Міхасём Чарняўскім. Там, у глыбінях гісторыі, яны шукалі і, здаецца, знайшлі той ген жыцця, што дапамог нашаму народу пераадолець сюррэалістычныя эпізоды гісторыі, не страціць пачуццё гармоніі.

І гэтаму Васіль Пятровіч вучыў сваіх вучняў: і калі выкладаў на кафедры графікі, і калі быў яе загадчыкам, і калі стаў прафесарам, рэктарам цяпер Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Сярод тых, хто з гонарам называў і называе яго сваім галоўным у жыцці Настаўнікам, — Мікола Селяшчук, Уладзімір Савіч, Рыгор Сітніца, Міхась Будавей, Вячаслаў Паўлавец і яшчэ дзясяткі выдатных, вядомых далёка за межамі Беларусі, мастакоў. А яшчэ, мяркую, ягоны брат Кастусь, графік, жонка Галіна, літаратар, сын Уладзіслаў, які дасягнуў вышыняў у сучасных камп'ютарных тэхналогіях, дачка Наталля — выдатная журналістка, мастацтвазнаўца, унучка Юля, дызайнер…

Васіль Пятровіч заўсёды ішоў са сваім народам, узначальваў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў у пераломныя 1990-я гады, калі ізноў было столькі чыста сюррэалістычных малюнкаў. Але ў Васіля Шаранговіча ёсць сяліба на Бацькаўшчыне, ці, як цяпер гавораць, на ягонай малой радзіме, дзе ён з асалодаю працуе на зямлі. Можа, таму, столькі вандруючы па свеце, столькі перажыўшы, ён ніколі не страчвае пачуцця гармоніі і веры? Веры ў родную зямлю, веры ў чалавека.

Галіна БАГДАНАВА

«Думы аб зямлі». З трыпціха «Дзе крыўда адвечная спела». Каляровая аўталітаграфія. 1982 г.

Знакі часу

У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага прадстаўлена выстаўка праекта «FRAMES OF TIME» вядомых беларускіх мастакоў Глеба Отчыка і Васіля Зянько.

Працуючы над увасабленнем адной ідэі, аўтары дэманструюць яе суб'ектыўнае асэнсаванне. У кожнага — свае адносіны з часам. Творчасць Васіля Зянько адрозніваецца глыбінёй і арыгінальнасцю выбраных тэм, якія могуць увасабляцца ім у цэлай серыі карцін альбо ў асобным творы. Нават калі мастак распрацоўвае адну і тую ж ідэю ў некалькіх праектах, кожны раз шукае новы ракурс.

Эстэтыка разумення часу ў Глеба Отчыка іншая. У экспазіцыі прадстаўлена каля дваццаці работ, створаных на працягу апошніх пяці гадоў. Большасць жа з іх былі напісаны ў 2018 годзе. Нават выкарыстоўваючы традыцыйныя мастацкія формы, Глебу Отчыку ўдаецца здзівіць. У экспазіцыйнай прасторы карціны майстра складаюць новы самастойны адзіны твор мастацтва. Глеб Отчык нібы старанна разгортвае на шэрагу палотнаў выбудаванае апавяданне пра час, а дакладней, пра пакінутыя ім сімвалы, знакі і кадры памяці.

Мастакі шмат падарожнічаюць па Беларусі, удзельнічаюць ў розных пленэрах. Крыніцай натхнення для абодвух з'яўляюцца простыя рэчы: маляўнічыя куткі малой радзімы, немудрагелістыя прадметы побыту.

Вікторыя АСКЕРА

ПРЭМІЯ: ДОСВЕД СУСЕДЗЯЎ

Чым адметны Першы Усеўкраінскі тэатральны фестываль-прэмія «ГРА»?

Напрыканцы снежня ўручылі ўзнагароды V Нацыянальнай тэатральнай прэміі. Але парадкавы нумар, за якім, меркавалася б, павінен хавацца досвед арганізацыі, не пазбавіў прэмію ранейшых недахопаў і дадаў новыя. Напрыклад, жывыя прагляды на этапе адбору спектакляў-намінантаў дагэтуль застаюцца недасяжнай марай — эксперты глядзяць відэазапісы не лепшай якасці. А фінальны этап тэатральнага спаборніцтва гэтым разам расцягнуўся на тры месяцы замест колішняга тыдня, канчаткова пазбавіўшы беларускую прэмію ідэі шоу-кейса і належнай дынамікі…

Фота Міланы Шыдлоўскай.

Сцэна са спектакля «Пад небам сінім».

Але ў гэтым тэксце гаворка пойдзе не пра беларускую, а пра ўкраінскую тэатральную прэмію. Улічваючы акалічнасці нашага тэатральнага жыцця, мне падаецца важным пільна глядзець навокал і аналізаваць не толькі свой досвед, але і суседзяў. З якімі выклікамі і праблемамі сутыкаюцца яны? Якіх поспехаў дасягаюць? За кошт чаго?

РАЗ, ДВА, ТРЫ — ГРА!

Увогуле, Украіна мае багатыя «прэміяльныя» традыцыі: у 1992 годзе была заснаваная і з 1993-га ўручаецца найстарэйшая на постсавецкай прасторы тэатральная прэмія «Кіеўская пектараль». Аднак яна яднае сталічны тэатральны працэс, і перад прафесійнай супольнасцю стаяла задача стварэння нацыянальнай прэміі, здольнай ахапіць працэс усёй краіны. Задача паспяхова вырашылася з выбраннем новага старшыні Нацыянальнай асацыяцыі тэатральных дзеячаў Украіны: у 2016 годзе гэтую пасаду заняў рэжысёр, мастацкі кіраўнік і дырэктар Кіеўскага нацыянальнага акадэмічнага тэатра аперэты Багдан Струцінскі. І напрыканцы 2018-га ў Кіеве падводзілі вынікі Першага Усеўкраінскага тэатральнага фестываля-прэміі «ГРА».

Аднак нельга абмінуць увагай працу, што папярэднічала гэтаму фінальнаму тыдню. Адбор намінантаў і пераможцаў адбываўся ў тры этапы. Першым крытэрыем для ўдзелу ў фестывалі-прэміі сталі заяўкі калектываў. Любы ўкраінскі тэатр, не зважаючы на тое, дзяржаўны ён ці прыватны, паводле палажэння, падаваў толькі адну заяўку. Удзельнічалі ў фестывалі-прэміі прэм'еры 2017 года. За перамогу змагаліся каля 70 пастановак. На пачатку экспертная рада фарміравала з пададзеных заявак лонг-ліст. У экспертную раду ўвайшлі 10 вядомых украінскіх тэатразнаўцаў і музыказнаўцаў на чале з кандыдатам мастацтвазнаўства, дацэнтам кафедры рэжысуры Кіеўскай муніцыпальнай акадэміі эстраднага і цыркавога мастацтваў Ганнай Ліпаўскай. Лонг-ліст быў сфарміраваны з 27 спектакляў. На другім этапе экспертная рада нажывую глядзела адабраныя пастаноўкі і выбірала з іх 12 намінантаў у 6 намінацыях («За лепшы драматычны спектакль», «За лепшы спектакль для дзяцей», «За лепшы музычны спектакль у жанры оперы / аперэты / мюзікла», «За лепшы харэаграфічны / балетны / пластычны спектакль», «За лепшы спектакль камернай сцэны» і «За лепшы пошукава-эксперыментальны спектакль»), а потым перадала паўнамоцтвы журы.

Падчас трэцяга фінальнага этапу ў Кіеве прайшлі паказы 12 спектакляў-намінантаў. Міжнароднае журы выбрала сярод іх пераможцаў. Цікава, што пры фарміраванні журы ў ахвяру аб'ектыўнасці быў прынесены кантэкстуальны крытэрый: сярод паважаных тэатральных суддзяў (оперны рэжысёр з Фінляндыі Лаура Акерлунд, добра вядомы беларусам літоўскі рэжысёр Ёнас Вайткус, рэжысёр з Грузіі Іраклій Гогія, тэатразнаўца з Польшчы Моніка Кваснеўска і дырэктар *Opera Europa* з Вялікабрытаніі Нікалас Пэйн) не было ніводнага ўкраінскага эксперта. І калі гаварыць пра недахопы, то варта згадаць яшчэ дэталь адборачнага этапу: падача адной заяўкі ад тэатра часам правакуе амбітных творчых людзей на тое, каб падаць не аб'ектыўна лепшы спектакль, а спектакль галоўнага рэжысёра (дарэчы, нягледзячы на іншую колькасць заявак у палажэнні беларускай прэміі, з гэтай праблемай, бывае, сутыкаемся і мы). Заснавальнікі фестывалю-прэміі запэўніваюць, што вопыт правядзення першага «ГРА» паўплывае на яго далейшы лёс і справакуе пэўныя змены. Работа над першым адборачным этапам «ГРА-2019» пачнецца ўжо ў сакавіку.

Зазначу, што ў параўнанні з беларускай мадэллю ўкраінская нацыянальная прэмія (нават з улікам пэўных недахопаў) падаецца мне больш жыццяздольнай, кансалідуючай, справядлівай і паспяховай. Напрыклад, паўтаруся, нам так і не ўдалося займець жывыя прагляды на этапе адбору, а для таго, каб развесці ў намінацыях спектаклі вялікай і камернай сцэны, спатрэбіўся досвед чатырох прэмій.

СЛЫННЫ МУЗЫЧНА-ДРАМАТЫЧНЫ

Але ж не арганізацыяй адзінай… Чым адметна сучаснае ўкраінскае тэатральнае мастацтва? Што за спектаклі трапілі ў фінал? Адразу зазначу, што брэнд «музычна-драматычнага» тэатра для Украіны па-ранейшаму актуальны. І самым цікавым спадкаемцам гэтай традыцыі сярод намінантаў «ГРА-2018», безумоўна, стала рэжысёр Тамара Трунова. У фінал прайшлі дзве яе пастаноўкі. «Дзідона і Энэй» (Грамадская арганізацыя *«Open Opera Ukraine»*, Кіеў) у намінацыі «За лепшы музычны спектакль у жанры оперы / аперэты / мюзікла» ды «Пад небам сінім» (Кіеўскі нацыянальны акадэмічны тэатр аперэты) у намінацыі «За лепшы пошукава-эксперыментальны спектакль».

«Дзідона і Энэй» уражвае не толькі зваротам да барочнай оперы Генры Пёрсела, але і актыўным уключэннем у драматычнае дзеянне хору. Апрануты ў стылёвыя касцюмы Хрысціны Карабельнікавай, хор нагадвае нейкі магічны рой, які можа выступаць адначасова і складана ўладкаваным адзіным арганізмам, і фонам-стыхіяй, з якой да гледача выступаюць персанажы другога плана.

У спектаклі «Пад небам сінім» акцэнты змяняюцца: да вядомай гісторыі сучаснага англійскага драматурга Дэвіда Элдрыджа, дзе тры пары настаўнікаў высвятляюць адносіны, Трунова дадае музычны складнік. Пра свае складаныя любоўныя перыпетыі настаўнікі не толькі кажуць, але яшчэ і спяваюць, і рухаюцца пад музыку ўкраінскага кампазітара Багдана Рашацілава, створаную адмыслова для гэтай пастаноўкі. Увогуле, адметнасць стылю Тамары Труновай — гэта нечаканая работа з музычна-драматычнымі прапорцыямі спектакля і дакладнасць іх «дазіроўкі» для кожнага асобнага выпадку.

ДРАМА МАЛЕНЬКАЯ…

Аднак найбольшую ўвагу, на маю думку, у «ГРА-2018» на сябе звярнуў драматычны блок у намінацыях на «За лепшы драматычны спектакль» і «За лепшы спектакль камернай сцэны». У малой форме спаборнічалі «Тата, ты мяне любіў?» (Кіеўскі акадэмічны тэатр «Залатыя вароты») ды «Віталік» («Дзікі тэатр», Кіеў). Імя дырэктара і мастацкага кіраўніка «Залатых варот» Стаса Жыркова ў тэатральнай Беларусі добра вядома. Яго намінаваны спектакль (дарэчы, паводле п'есы беларускага драматурга Дзмітрыя Багаслаўскага) мы бачылі ў Магілёве ды Мінску. Але паказ у арыгінальнай прасторы-пенале пакідае зусім іншыя ўражанні. Два глядацкія шэрагі каля доўгай сцяны і акцёры на адлегласці выцягнутай рукі ад залы... Сцэнічная прастора нагадвае калодзеж (што з'яўляецца ў тэксце як ружжо, якое мусіць стрэліць у фінале), куды правальваюцца і акцёры, і гледачы. Імклівыя перамяшчэнні герояў між чатырма дзвярыма на сцэне пакідае надзею, што нас яшчэ выцягнуць, як вядро з вадой. Але калі Аляксандр (Раман Ясіноўскі) крэйдай піша ў фінале на глухой чорнай сцяне, фактычна дне, «Я ў калодзежы», то глядач разумее: і ён там жа.

«Віталік» — гэта п'еса, што паўстала з постаў на Фэйсбуку драматурга Віталія Чэнскага. Спектакль пра марыупальскага хлопца, што перабраўся ў сталіцу ды вандруе па здымных кватэрах як той Уліс, паставіў мастацкі кіраўнік Дзікага тэатра Максім Галенка. Для стылю Галенкі характэрна пэўная правакацыйнасць (дарэчы, Дзікі тэатр, якім ён кіруе, мае слоган «Тэатр, што правакуе»). І «Віталік» са сваёй гранічнай мужчынскай шчырасцю цалкам адпавядае гэтай характарыстыцы: у пастаноўцы шмат сексу ды палітыкі — а пра што ж яшчэ размаўляюць мужчыны? Аднак рэжысёрская работа звяртае на сябе ўвагу не толькі правакацыйнасцю, але і цікавым рашэннем увесці ў гэты монаспектакль два галасы — тонкі і кранальны Віталік у шлюбнай сукенцы (як бы з алюзіяй: і тут уваходжу я, увесь у белым, без адной заганы — Аляксей Дарычэўскі) ды брутальны Віталік у майцы з алімпійскім мішкам (такі сабе пераможца па жыцці — Андрэй Кранглеўскі). Але гэтыя два галасы чуюцца з адной лодкі Уліса…

…І ДРАМА ВЯЛІКАЯ

За перамогу ў намінацыі «За лепшы драматычны спектакль» змагаліся рэгіянальныя тэатры: «Уяўны хворы» Харкаўскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра лялек імя В. А. Афанасьева ды «Вій. Докудрама» Чарнігаўскага абласнога акадэмічнага ўкраінскага музычна-драматычнага тэатра імя Т. Р. Шаўчэнкі. Мастацкі кіраўнік Харкаўскага тэатра Аксана Дзмітрыева паказала, якім можа быць кампраміс паміж глядацкім і рэжысёрскім «Я хачу!». Глядач прагне камедыі, і Дзмітрыева прапануе, але не «Занадта жанатага таксіста» ці «Лэдзі на ноч», а Мальера з алхімічным тонкім рэжысёрскім рашэннем ды яркімі акцёрскімі работамі (асабліва варта адзначыць выканаўцу ролі Аргана Вячаслава Гіндзіна). У фінальнай праграме спектакль Аксаны Дзмітрыевай адчувальна стаіць паасобку, бо рэальнасць, створаная ёй ды мастаком Наталляй Дзянісавай на сцэне, амаль не мае сувязей з сённяшнім парадкам дня (палітычным, сацыяльным). «Уяўны хворы» выглядае хутчэй як казка мінулых часоў, але казка густоўная ды напраўду смешная.

«Вій» застаецца адным з самых важных твораў для ўкраінскай сцэны. Для XX стагоддзя самым яркім пераасэнсаваннем гэтага сюжэта, напэўна, стаў тэкст Астапа Вішні, пастаўлены ў 1925 годзе Гнатам Юрой. У XXI стагоддзі ўсе шансы стаць кананічным пераасэнсаваннем мае п'еса Наталлі Варажбіт «Вій. Докудрама». Два замежнікі едуць ва ўкраінскую вёску: адзін — каб пабачыць зямлю продкаў, другі — так, за кампанію. Але неўзабаве для аднаго з іх гэтае роўдмуві пераўтвараецца ў містычны трылер. Сутыкаючы рэальнае, побытавае ды ірэальнае (напрыклад, вясковае вяселле пад Верку Сярдзючку; шабаш, дзе ведзьмы рытуальна вымешваюць цеста), мастацкі кіраўнік Чарнігаўскага тэатра Андрэй Бакіраў не дазваляе зале выключыцца з напружанага, трывожнага чакання: «Што будзе далей?»

***

Такім чынам, сярод адметных рыс сучаснага ўкраінскага тэатральнага працэсу можна вылучыць зварот да традыцыі ды спробы яе развіцця (напрыклад, той жа музычна-драматычны складнік ці пераасэнсаванне «Вія») ды цікавасць да сучаснай драматургіі (як сваёй, так і замежнай — брытанскай, беларускай).

Увогуле ж, з'яўленне Усеўкраінскай прэміі вырашыла не толькі ўнутраныя працэсуальныя пытанні, але і стала выдатнай магчымасцю пабачыць рэпрэзентатыўны зрэз тэатральнага мастацтва Украіны для тых, хто звонку.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ
Фота прадастаўлена фестывалем-прэміяй «ГРА»

фестываль

У аб'ектыве Паднябеснай

Шэсць кітайскіх фільмаў: уваход свабодны

На гэтым тыдні ёсць магчымасць глядзець кітайскае кіно. Адмысловы фестываль ладзіцца на пляцоўцы кінатэатра «Цэнтральны».

Пачала імпрэзу карціна «Вялікі майстар», якая была вылучана на «Оскар» па выніках 2014 года і распавядае пра школы баявых майстэрстваў, якія раз'яднаныя, але, па сутнасці, займаюцца адной справай. Стужка «Балет у полымі вайны», створаная ў 2015 годзе, звяртае да часоў Другой сусветнай і расказвае пра мірныя мары, пра свет цудоўнага мастацтва, якія дапамагаюць перажыць жудасныя падзеі. У праграму ўключаны і камедыйны фільм «Несумленных прашу не турбаваць — 2», які звяртае да сямейных адносінаў. Сёння (12 студзеня) у аматараў баевікоў і баявых мастацтваў ёсць магчымасць паглядзець стужку «Шаалінь». Тым, хто хоча зразумець, што ёсць сямейная драма пакітайску, варта выправіцца ў суботу днём на фільм «Песнь бавоўны». У нядзелю ўвечары ў кінатэатры «Цэнтральны» будуць разгортвацца шпіёнскія жарсці (меладрама «Няўлоўны»). На ўсе сеансы ўваход вольны, варта толькі звярнуцца па ўваходныя квіткі загадзя.

за кадрам

МОВАЙ ПЛАКАТА

Як завабіць людзей у кінатэатры, ведалі мастакі

З чаго пачынаецца кіно для гледача? З плакатаў ці афіш, якія інтрыгуюць і зазываюць у кіназалу? Прынамсі, так было. Так уваходзілі ў свядомасць беларусаў першыя стужкі, знятыя ў рэспубліцы, і з'яўлялася разуменне пра тое, што ёсць наша кіно.

Сёлета споўніцца 95 гадоў, як Беларусь з кіно… Як усё пачыналася і разгортвалася, дапамагае ўявіць выстаўка «Беларускі кінематограф 1920—1930-х гадоў у кінаплакаце», што працуе ў Музеі гісторыі беларускага кіно, філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Выстаўка можа здзівіць як фактамі, так і мастацкімі выявамі, якія адлюстроўвалі сутнасць фільмаў. Напрыклад, ці ведаем мы, колькі стужак было створана за час існавання Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» (і яе папярэдніц «Белдзяржкіно», «Советская Беларусь»)? Больш за 550, калі меркаваць па назвах. А ў перыяд з 1926 па 1941 гады іх было 60. Менавіта гэты перыяд гісторыі айчыннага кіно пазначаны такой важнай часткай кінапрацэсу, як кінаплакат. 35 поўнафарматных кінаплакатаў да беларускіх фільмаў 1926—1940 гадоў адлюстроўваюць працэсы кінатворчасці і нават паказваюць той час, калі нямое кіно пераходзіла да выкарыстання гуку, што адбілася і на рэкламе.

Кіно як масавае і папулярнае мастацтва адразу прыцягнула ўвагу выдатных творцаў, што сталі рабіць кінаплакаты, якія, выконваючы заказы студый, давалі волю сваёй фантазіі. Гісторыя беларускага кіно ў плакаце стваралася супольна: акцыянернае таварыства «Саўкіно» мела свае рэкламныя бюро ў Маскве і Ленінградзе, з якімі супрацоўнічалі вядучыя майстры-плакатысты: Уладзімір Стэнберг, Максім Літвак, Міхаіл Длугач, Ізраіль Боград, Мікалай Хомаў, Дзмітрый Буланаў, Барыс Зяленскі, Міхаіл Векслер. Творы гэтых аўтараў сёння прадстаўлены на выстаўцы.

Але не толькі імёнамі аўтараў яна прыцягвае. Яшчэ і імёнамі на плакатах. Імёнамі, якія напісаныя па-беларуску (як і самі кінаплакаты створаны на беларускай мове). Напрыклад, імя, якое дало назву фільму: «Кастусь Каліноўскі». На выстаўцы адразу 3 кінаплакаты да стужкі «Кастусь Каліноўскі», якая мела быць першым фільмам (як цяпер сказалі б «маштабным нацыянальным кінапраектам»), які б засведчыў з'яўленне беларускага кіно. Але гісторыя распарадзілася інакш, і цяпер плакаты да фільма «Лясная быль» увасабляюць пачатак гісторыі стварэння айчыннай кінагаліны, але і сведчаць пра тое, як мастак праз сваю вобразную мову мог падкрэсліць стаўленне да фільма. Адметна, што плакаты на беларускай мове мелі вялікія наклады, пры тым, што друкаваліся ў Маскве (прынамсі, да фільмаў «Кастусь Каліноўскі», «Песня вясны», «Джэнтльмен і певень») — гэта сведчыць пра разгалінаваную пракатную сетку ў рэспубліцы на той час і запатрабаванасць прадукцыі, якая прыцягвала людзей зразумелай ім мовай. Сярод новых набыткаў музея — плакат да фільма Марка Данскога і Міхаіла Авербаха «У вялікім горадзе» і поўнафарматны варыянт плаката да карціны Уладзіміра Корш-Сабліна «Першы ўзвод».

Выстаўку называюць вынікам 15-гадовай пошукавай работы супрацоўнікаў Музея гісторыі беларускага кіно ў архівах Расіі, якая дазваляе ліквідаваць белыя плямы мінулага беларускага кінематографа. Калекцыя кінаплакатаў прадстаўлена ў такім аб'ёме ўпершыню за 75 гадоў. І ўсё яшчэ ёсць падставы для далейшай працы: былі часы, калі кінаплакат быў галоўным і дзейсным сродкам рэкламы большасці фільмаў, таму часам выпускалася па 2 ці 3, а часам і больш разнастайных кінаплакатаў і фотаафіш. І яны ўсе мелі плён: людзі глядзелі беларускае кіно.

Цяпер успомніць той час дапамагае мастацтва кінаплаката, якое жыве дзякуючы мультымедыйнаму дадатку да калекцыі плакатаў на трох мовах (беларускай, рускай і англійскай), дзе раскрываюцца асаблівасці вобразна-стылявога рашэння айчынных кінаплакатаў, нават ёсць магчымасць пазнаёміцца з біяграфіямі аўтараў.

Марыя АСІПЕНКА

глядзім

Беларускае...

Калі хто яшчэ не паспеў паглядзець адзін з самых рэзанансных айчынных фільмаў мінулага года, то ёсць магчымасць гэта зрабіць: «Хрусталь» Дар'і Жук дэманструецца ў «Доме кіно» да 16 студзеня ў межах праекта «Лістапад. Калекцыя».

Стужка ўжо паспела паўдзельнічаць у больш чым 20 міжнародных кінафестывалях, у тым ліку ў Варшаве, Лондане, Карлавых Варах, Каіры. Адзначана ўзнагародамі на фэстах у Адэсе, Тбілісі, Выбаргу і іншых. А ў Расіі некаторыя крытыкі наогул назвалі фільм самым яркім кінадэбютам мінулага года. Звярнула ўвагу на «Хрусталь» і крытыка за акіянам, што зразумела: постсавецкая рэчаіснасць, што крочыць з экрана, для тамтэйшага гледача з'яўляецца ў нейкім сэнсе экзотыкай. Зрэшты, для маладога айчыннага гледача — таксама. Для таго, хто не заспеў час, калі заробак выплачвалі прадукцыяй і мара пра нармальнае жыццё ўвасаблялася ў жаданне памяняць месца жыхарства. Але фільм усё ж пра людзей: якімі яны былі тады, чаго хацелі, як існавалі ў часе, да чаго імкнуліся. Час паказаны праз гісторыю маладой дзяўчыны Велі, якая мае «амерыканскую мару» і, дзеля таго, каб яе рэалізаваць, трапляе ў звычайную сям'ю правінцыйнага горада, дзе сутыкаецца з рэчаіснасцю…

Сусветнае…

Пра тое, чаму чалавечы свет жорсткі, прапануе паразважаць сусветна вядомы рэжысёр з Паўднёвай Карэі Кім Кі Дук. Яго стужку «Чалавек, месца, час і зноў чалавек» можна адшукаць у кінатэатрах «Піянер» і *Falcon Club* Буцік Кіно.

Фільм, які быў прадстаўлены ў 2018 годзе на Берлінскім кінафестывалі ў асобнай праграме «Панарама». А філасофскі зварот аўтара да тэм вечных усё ж скіраваны да сучаснага гледача, які часам проста забывае пра тое, што з'яўляецца найвышэйшай істотай зямнога разумнага свету. «Няўжо?» — задае пытанне рэжысёр, адпраўляючы сваіх герояў у марскі круіз. Публіка на караблі сабралася вельмі розная: ад палітыкаў да гангстараў, прастытутак і закаханых. Але як яны могуць змяніцца ў залежнасці ад абставін і чаму? Што ператварае людзей у жудасных пачвар, пазбаўленых маралі? Рэжысёр вядзе жорсткую размову пра тое, што ёсць прырода чалавека і хто здольны (ці мае права) выжыць у гэтым свеце. Вобраз карабля, які недзе згубіўся, узнікае невыпадкова, але ці стане гэты карабель каўчэгам для яго пасажыраў?.. XXI стагоддзе, відаць, падкідвае творцам тэмы, абмінуць якія яны не могуць, калі ставяцца да жыцця адказна.

Рэтраспектыўнае…

Персанальную рэтраспектыву з нагоды 120-годдзя галівудскага акцёра Хамфры Богарта наладзілі ў Музеі гісторыі беларускага кіно. Шэраг стужак, аб'яднаных агульнай назвай «Вялікі Богі, альбо Лепшы з лепшых», прапанаваны ў студзені. Адна з іх — славутая «Касабланка» 1942 года (сеансы ў пятніцу 11 студзеня) рэжысёра Майкла Керціца. Стужка, створаная паводле п'есы М. Бернета і Дж. Элісан «Усе прыходзяць да Рыка», звяртае да Другой сусветнай вайны. Гэты фільм у біяграфіі Богарта адметны: пасля яго ён стаў самым высокааплатным артыстам свету на той час. Ды і сама карціна мела высокія адзнакі: прэміі «Оскар» за лепшы ігравы фільм, за лепшы сцэнарый і рэжысуру. Акрамя таго, стужка трымае першае месца ў спісе «100 найбольш страсных амерыканскіх фільмаў за 100 гадоў» (паводле Амерыканскага інстытута кінамастацтва). Варта адзначыць, што партнёркай Х. Богарта была выдатная актрыса Інгрыд Бергман. Разам яны стварылі на экране драму пра каханне і высакародныя пачуцці.

Наперадзе яшчэ шэраг стужак з удзелам Х. Богарта, сярод якіх і «Амерыканская каралева», фільм, што прынёс акцёру «Оскар» за лепшую мужчынскую ролю. Ён узначаліў спіс «100 найвялікшых зорак за 100 гадоў» (у 1999 годзе).

На сваёй струне

МАРЫНА

Ларыса СІМАКОВІЧ, кампазітар

У кожнага з нас свая гісторыя. Для дынамічнага развіцця сюжэта неабходная порцыя інтрыг, порцыя расчараванняў, а таксама важкі куль знамянальных сустрэч і страт. У кожнага жыцця свая драматургія і свае рухавікі ўзыходжання.

Дзяўчынка з паэтычным і пазычаным у мора і паэзіі імем Марына марыла вучыцца ці ў Лондане, ці ў Вене. Пра тое, што гэта магчыма, нехта нашаптаў на вуха школьніцы-навучэнцы гімназіі-каледжа пры акадэміі музыкі, у галаве якой, нібы пчолы, раіліся мелодыі Ф. Шапэна, фугі І. С. Баха, эцюды К. Чэрні. Чаму ў Лондане ці Вене? А вы запытайцеся ў таго, хто нашаптаў.

ВЕНА

Карта падскочыла некалькі разоў, перавярнуўшыся ў паветры. На карце — далёкае падарожжа. На карце — Аўстрыя, сталіца музычнай Еўропы Вена.

Радасць затрымцела весніцай і дарадцай, беспамылковым індыкатарам праўды. Мовай інтуіцыі і Анёла-ахоўніка. Мовай, якую ні з чым не зблытаеш, на якую немагчыма забыцца. Мовай, якая будзе падкідваць падказкі, калі жыццё пачне выпрабоўваць мудрагелістымі сюжэтамі і спыненым, замаруджаным часам. Альбо схаваецца на глыбіні сябе самога і не дазволіць гвалтоўна пераблытаць абраныя сцяжыны. Не здрадзіць сабе, нават калі ўвесь свет адвярнуўся і супраць, — галоўнае выпрабаванне ў вялікім падарожжы.

Суцэльная імправізацыя. *«Лягчэй за ўсё спраўджваюцца тыя мары, у якіх не сумняваешся»*. Паштовачны эскіз, эскізная перапіска. Запрашэнне. Прыезд. Гасцяванне. Цуд першай раніцы — раяль. Лёгка адамкнулася, узнялася крышка раяля, агаліўшы пераспелыя цнатой клавішы. *«Раяль цалуе тонкая рука…»* Струны гудзелі нізкімі актавамі і абуджалі дзень. Гукі выйшлі з берагоў, паплылі, вадаспадам абрынуліся на вузкую венскую вулку. Горад навастрыўся. Услухаўся. Гораду спадабалася. Горад пажадаў займець музычную падзею.

Канцэрт дзяўчынкі-беларускі стаўся дзівам. Відавочным паўстаў імператыў: там, дзе няма магчымасцяў, з'яўляецца сіла пераадольвання. Гучныя авацыі адпавядалі здзіўленню. Здзіўленне захацелася падоўжыць. Дзяўчынцы прапанавалі застацца — вучыцца ў адной з лепшых музычных устаноў Аўстрыі.

Марына і мроя злучыліся. Мара спраўдзілася. Засталося перайсці «мора» даўжынёй у дзевяць гадоў прафесійнага навучання ў Венскім універсітэце музыкі і выканальніцкага мастацтва на глыбіні ў сотні падручнікаў па нямецкай мове, гісторыі выканальніцкага мастацтва. Яшчэ адзін карабель узяў курс. І гэты карабель ведаў, куды плысці.

«РАЗОЎ СА ДВА СХАДЗІЎ У ПРУСЫ — КУДЫ НЕ ТРАПЯЦЬ БЕЛАРУСЫ?..»

Музычны цэнтр Еўропы. Вячэрнія шпацыры, гістарычнае паветра, што памятаюць хваляванні В. А. Моцарта, хуткую хаду Л. ван Бетховена, Ф. Шуберта, Ё. Брамса… Венскі ўніверсітэт музыкі і выканальніцкага мастацтва — міжнародны лідар у галіне даследаванняў музычнага і выканальніцкага мастацтва, месца, дзе мастацтва, культура сыходзяцца, каб развівацца, утрымліваючы раўнавагу паміж традыцыямі і інавацыямі. Месца, дзе выкладалі Антоніа Сальеры і Антон Брукнер, дзе вучыліся вядомыя выпускнікі Клаўдыа Абада, Густаў Малер, Зубін Мета, Генрых Нейгаўз, Марыс Янсан і інш.

Жыццё прапанавала новы лад, новае асяроддзе, напружанае спасціжэнне сябе і крышталёвай сутнасці ўласных тонкіх энергій.

Паглыбленне ў музычнае жыццё горада кружыла галаву. Традыцыі і рытуалы здзіўлялі ўпарадкаванасцю. Знаёмства з музычнай эксперыментальнай эстэтыкай ледзь паспявала за знаёмствам з музычнымі тэхналогіямі і кінетычнымі светлавымі інсталяцыямі. Студэнцтва захапляла, цікава было ўсё, недапушчальным — марнаванне часу. Свабода — гэта ж не адсутнасць абмежаванняў, а неабмежаванасць магчымасцяў.

Тэма дыпломнай работы студэнткі з Беларусі здзівіла венскую прафесуру. Яны не здагадваліся, колькі каштоўнай інфармацыі пра гісторыю горада і яго геніяў не было ўлічана. Наколькі «схуднеў» спіс духоўных каштоўнасцяў горада за апошнія дзесяцігоддзі. Дыпломная работа Марыны Рамейкі набыла статус даведніка па забытых венцамі мясцінах горада, дамоў, вуліц, падзей. Так вяртаюць страчанае.

ВЯРТАННЕ

Развіццё на тое і развіццё, каб здараліся перамены, зрухі, каб назіраць за зменамі, здзіўляцца інакшаму ў сабе, быць гатовым сустрэцца з інакшым, здзівіцца «прапанаваным абставінам» і таму, як непрыкметна робяць яны сваю працу, каб на засеяным полі асабістага росту ўзышлі новыя краскі. Назіраць, як цьмяна акрэсленае раптам набывае графічны абрыс, а тое, што здавалася звычным, неад'емным, сваім, гучна галосіць родным голасам і нецярплівым патрабаваннем быць разам, побач, поруч. А шчасце, калі недзе і затрымліваецца, не бяда: радасць можна наблізіць усведамленнем добра зробленай працы.

Учарашнія псіхалагічныя падпоркі зніклі, як мажор і мінор у Шонберга. Трэба было, як некалі гэты самы Шонберг, ствараць новыя псіхалагічныя матывы-комплексы, каб выстаяць пад хваляй здабытага досведу.

Фота Сяргея Махава.

Чужыя краіны — як далёкія танальнасці: пасля іх прыемна вяртацца ў цёплае гняздо зыходнай танальнасці! Які ж ён усё-ткі жывучы, Багдановічавы імператыў, што палошчыцца навальніцамі, прадзімаецца вятрамі, якім насычана прастора і паветра беларускай зямлі: «Тут ёсць свая адметная краса, адметная рытміка, адметны чар. Трэба іх падгледзець, знайсці і вынесці на шырокі свет…»

Жыццё не спыняецца ўчарашняй раніцай. Жыццё прыспешвае. Вяртанне на радзіму выглядае натуральным і арганічным, як вяртанне птушак з выраю «ў гнёзды свая». І той, хто вяртаецца, вяртаецца інакшым. Бачанне сутнасці рэчаў мяняецца. Ва ўласнай сістэме каардынат адбываюцца «тэктанічныя» зрухі. Вабны, уладаваны дабрабыт не апраўдвае ашчаднасць эмоцый і жорстка акрэсленую зону асабістай недатычнасці. А вось жаданне вярнуцца вярэдзіць, і прага ўскалыханай дзяцінствам радасці перапаўняе ўсе іншыя жаданні. Радасць хочацца множыць.

Пра радзіму Марына гаворыць словамі Жуль Рэнара: «Мая Радзіма там, дзе праплываюць самыя прыгожыя аблокі». І ад сябе: «Там неба бліжэй… і лужыны больш празрыстыя… І людзі — на эмоцыі шчодрыя, на пыху эканомныя… як бы сам Бог тут над зямлёю прайшоў і глянуў міласціва…»

Ёсць такая дзівосная ластаўчына трава — беларускі жэньшэнь, падтыннікам завецца. З яе ластаўкі па вясне збіраюць сок расліны, ляцяць з ім да слепа народжаных дзяцей, каб вярнуць ім зрок. З іх адлётам трава вяне і засыхае. Трэба зноў перачакаць восень і завейную зіму, каб з далёкага выраю зноў вярнуліся ластаўкі і разам з імі зноў вымкнуліся з глебы маладыя парасткі ластаўчынай травы на знак ачышчэння.

…А МУЗЫКА КОЖНЫ РАЗ ІНШАЯ…

Заўважана: на сцэну сучаснага выканальніцкага мастацтва выходзіць новы тып музыканта, не абцяжаранага заклапочанасцю ўласнымі амбіцыямі.

Іх прафесіяналізм бясспрэчны. Прыярытэты вызначаныя.

Яны лёгкія на пад'ём, супрацоўніцтва, эксперыменты і творчы экстрым. Яны лёгка арыентуюцца ў засвоеных параметрах культурных плыняў, стыляў, жанраў, лёгка балансуюць паміж акадэмічным і альтэрнатыўным спосабам выказвацца. Яны маюць досвед сучаснага музычнага кантэнту, любяць Еўропу, яшчэ больш — Беларусь.

Яны адкрываюць сабе і свету найноўшую айчынную музыку, забяспечваючы ёй і сабе камфортнае існаванне на сцэнічных пляцоўках агульнаеўрапейскага абшару.

Яны гатовы ўзбагачаць сваю выканальніцкую палітру новымі сучаснымі нацыянальнымі ініцыятывамі, якімі б рызыкоўнымі ні былі.

Іх трэба навучыцца пазнаваць, гэты неардынарны тып асобы. Сёння яны яшчэ непрыкметныя, а заўтра — майстрыновай сучаснасці. Іх жыццёвыя, прафесійныя прыярытэты суправаджаюцца ўласным выбарам. Яны гатовы абжываць «нефарматныя» канцэртныя пляцоўкі і арыгінальныя прасторавыя «аб'ёмы». Ствараць новыя фестывалі з візуальна-сцэнарнымі аспектамі. На разнастайных творчых платформах выконваць акадэмічную і альтэрнатыўную музыку, дэманстраваць прэм'еры, яднацца ў пошуку новых форм і жанраў, прынамсі, начных канцэртаў з атмасферным настроем і новым фарматам музыкі.

Ім хапае 3'34 хвіліны «кейджаўскай» цішыні, каб пачуць новыя павевы ў паветры.

І там хто ведае, як яна ўзрастае і набывае вастрыню прыналежнасці да нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Некалі ж Янка Купала папярэджваў: *«І прыйдзе новых пакаленняў на наша месца грамада судзіці суд, ці мы сумленна жыццё прайшлі, ці чарада зняваг мінулых нас не з'ела, пакінуўшы свой дым і чад, а мы па-звыкламу няўмела жывём не ў лад і неўпапад»*.

ЭКСТАТЫЧНАЯ ЭКЗІСТЭНЦЫЯ

Прафесійны інтарэс рэдка калі абмяжоўваецца статусам саліста. Неверагодная магнетычная прыцягальнасць — камерная музыка. Прыцягальнасць сумеснага музыкавання — у асабістай энергаёмістасці кожнага з музыкантаў, здольнасці індывідуальных энергій, сустрэўшыся на агульнай плошчы, утвараць непаўторныя, ні з чым не параўнальныя энергетычныя субстанцыі, своеасаблівыя энергетычныя палі. Не можа паўтарыцца імгненне, хвіліна, бо час яе нараджэння прадыктаваны кожны раз новай кансістэнцыяй цішыні і напружання. У кожнага імгнення свая праўда і свая прыгажосць. Свае аблокі над горадам. Узыход учарашняй зоркі не перанясеш у дзень сённяшні. Штрыхі, тэмпы, гукавы баланс ствараюць цуд, у дыяпазоне якога ўсё становіцца інакшым, жывым і сапраўдным. Ноты нязменныя, а музыка кожны раз іншая.

Экстатычнай экзістэнцыі душа музыканта ціха спявае гімны. Гімны цудоўнаму супадзенню, узрушэнню, спыненым хвілінам — зіхатліваму свету і святлу... *«…іх захапляў свет безгранічны і ўласны лёс іх таямнічы…»*

ІРАЦЫЯНАЛЬНАЕ

Пажыць на чужыне і неаднойчы засвяціцца ціхай радасцю: нібы ўпершыню адчуць сябе беларускай у сэнсе самавызначэння сябе, на якое адгукаецца наша свядомасць, нейкая свая, ні на што не падобная, музыка. Авалодаць нямецкай мовай і не ведаць сваёй? Нонсэнс! *«…мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена, мы не дзікай травы самарослыя парасткі…»*

Вяртанне на радзіму ва ўзросце Скарыны з кніжкамі пад пахай — асэнсаванае і ўзважанае. Як заўважыў Алесь Разанаў, не вернецца воін, вандроўнік не вернецца, вернецца сейбіт… Заўсёды вяртаецца сейбіт. Хіба можна адмовіцца ад агню і праўды айчыннай гісторыі, мастацтва? Ад мовы Яна Чачота, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча? Сучаснасць супадае з беларускай мовай. Яе актуальнасць бясспрэчная, як і актуальнасць сучаснай беларускай музыкі, якая выклікае вялікае зацікаўленне. Яе хочацца вывучаць, выконваць, знаёміць з ёю айчынную і замежную публіку. Новая музыка адкрывае новае. З ёю лацвей рухацца далей — да майстэрства, спецыфічнасці, эксклюзіўнасці.

«НА МЯЖЫ»

Кожнае імгненне нясе падзею. Марына Рамейка будзе размаўляць мовай музыкі. Напярэдадні — сольная праграма «На мяжы» — канцэрт на сцэне Малой залы імя Р. Шырмы Белдзяржфілармоніі. Праз пару дзён, 18 студзеня. Будзе гучаць музыка Аляксандра Скрабіна — ранні опус кампазітара — «24 прэлюдыі для фартэпіяна». Касмічны А. Скрабін блізкі яшчэ і сваім юнацкім імкненнем напісаць оперу «Кейстут і Бірута» паводле літвінскага гістарычнага падання…

Пазнакі іншаземнага эзатэрычнага «падарожжа» зрэзануюць з вібрацыямі касмічнага бязмежжа. Таямніцамі-бліскавіцамі будзе ўспыхваць іншасвет музыкі *на мяжы* сузор'яў В.-А. Моцарта, Р. Шумана, А. Скрабіна. *«…мароз на небе ставіць троны, вянцы на месяц ускладае, па снезе зоркі рассыпае…»*

Разгадка будзе здавацца магчымай...

Скарбонка Спадчыны

Фота Максіма Вечара.

ВЕСЯЛОСЦЬ КАЛЯДНАГА ІГРЫШЧА

«За мной дзеўкі ўсе носяцца»

Снежань і студзень у народным календары беларусаў зазвычай праходзілі пад знакам Калядаў. Гэтага свята чакалі, да яго рыхтаваліся, таму і спраўлялі заўсёды шумна і весела, усёй вясковай грамадой. Бо традыцыйна завяршэнне года ў народзе лічылася ці не самым цяжкім перыядам. Ночы доўгія і халодныя, час цягнецца павольна, ды яшчэ і пост, што пачынаецца ў канцы лістапада і доўжыцца да Калядаў, забараняе танцаваць, спяваць і весяліцца. Гэтымі днямі многія хварэлі, адбываліся страшныя падзеі. Памятаеце Купалаву раннюю паэму «У Піліпаўку» з трагічным сюжэтам, напоўненую жахамі і містыкай? Таму, калі складаны час мінаў, усе стараліся павесяліцца, патанцаваць і нагуляцца, нібы кампенсуючы страчаны час.

Магчыма, у такой чаканай радасці варта шукаць і карані трывалага замацавання неабходнасці шумна святкаваць Каляды. І сёння многія калядуюць, калядоўшчыкаў вітаюць не толькі ў вясковых хатах, але і ў гарадскіх кватэрах. А на Лепельшчыне, Вілейшчыне і Глыбоччыне, як і спрадвек, моладзь ладзіць гульню «Жаніцьба Цярэшкі» (гэтае ігрышча ўнесена ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі). Дарэчы, вясёлае свята, што дазваляе з прыемнасцю прабавіць час усёй грамадзе, таксама «прыжылося» ў горадзе. Цярэшку неаднойчы «жанілі» ў Мінску і Віцебску, падчас адмысловых вечарын Дударскага клуба, Спеўнага сходу, свята праходзіла ў постфальклорным клубным фармаце.

Сама па сабе гульня «Жаніцьба Цярэшкі», якая ладзілася ў адзін з калядных вечароў і магла доўжыцца аж тры дні, вельмі цікавая. Па сутнасці гэта вясельна-тэатральная дзея, што спалучае тэатр, спевы, танцы, музыку, імправізацыю. Моладзь збіралася ў хаце ці карчме і танчыла, прыглядаючыся адно да аднаго. З боку старэйшых выбіралі «бацьку» і «маці», якія сачылі за парадкам правядзення абраду, рытуальна-абрадавым частаваннем і агульнай весялосцю.

Бацька зазвычай спявае такую песню:

Я дзядок яшчэ нічога,
Пасадзіў пшанічкі многа,
А пшанічка ўся калосіцца,
За мной дзеўкі ўсе носяцца.

Каля поўначы пачыналася ўласна «жаніцьба». Бацька выводзіў дзяўчыну, матка — хлопца і «скручвалі» іх у танцы. Пасля гэтага «маладыя» звалі адно аднаго «бабулька» і «дзядулька», пераўвасабляючыся такім чынам у продкаў. Калі ўсе пары «перакручваліся», удзельнікі абраду па чарзе лавілі адзін аднаго, суправаджаючы працэс вясёлымі прыпеўкамі-«цярэшкамі».

Глыбінная сутнасць абрадавай гульні заключаецца ў магчымасці для моладзі пазнаёміцца, знайсці сабе пару. Цікава, што ў «Цярэшцы» няма гледачоў і выканаўцаў, усе з'яўляюцца ўдзельнікамі.

Але ж хто ён такі, гэты загадкавы Цярэшка, якога неабходна было «ажаніць»? Персанаж Цярэшка мае міфічнае паходжанне. Ён сустракаецца ў народнай казцы і з'яўляецца «драўляным хлопчыкам», што ажывае на радасць бяздзетным бацькам, а з цягам часу ў народнай свядомасці ператвараецца ў апекуна, дарадчыка. У тапанімічным паданні аб вёсцы Цярэшкі Вілейскага раёна яе заснавальнік Цярэшка — мудры і таямнічы чалавек, які ведае час сваёй смерці і памірае ў адзіноце. Так адыходзілі ў іншы свет, згодна з беларускімі вераваннямі, чарадзеі і варажбіты. Таксама «цярэшкам», адпаведна слоўніку Івана Насовіча, звалі матылька, які, як вядома, «засынае» на зіму, робіцца нежывым, а ўвесну «ажывае», як драўляны хлопчык з казкі.

Даследчыкі сыходзяцца ў меркаванні, што за вобразам Цярэшкі можа хавацца старажытнае боства кахання. Магчыма, гэта і праўда, бо, як паказвае практыка, даволі часта пары, што ўтварыліся для жартоўнага вяселля, потым ствараюць сапраўдныя сем'і. Нават нашы продкі ставіліся да гэтай жартоўнай гульні досыць сур'ёзна: у гэты вечар мог вырашыцца іх лёс і сямейнае шчасце. Дарэчы, паводле няпісанага правіла, дзяўчына-«бабулька» не мае права наўпрост адмовіцца ад «дзядулькі», выбранага для яе. Але спосаб уцякчы ад яго ўсё ж існуе: гэта можна зрабіць падчас танцаў і прыпевак, калі хлопец павінен дагнаць дзяўчыну і пацалаваць.

Марына ВЕСЯЛУХА

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
10.01.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1218

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 229

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.